ПРАЛЕТАРЫ УСЯГО СВЕТУ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

# ЗЬВЯЗДА

№ 146 (3254) Субота, 29-га чэрвеня 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі.

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, кантора—781

**ШАНГХАЙ, 28.** Як паведамляе „Норд-Чайна Дэйлі Ньюс“, тры найбольшыя раёны, правінцыі Хубэй-Ві-Шоу, Чань-Ян і Люжуан, захоплены рэвалюцыйнымі войскамі пад кіраўніцтвам камуністых.

## Дзень індустрыялізацыі на шчацінай фабрыцы

**ГОМЕЛЬ.** (*Наш кар.*). *На шчацінай фабрыцы адбыўся мітынг рабочых, на якім пастаноўлена стварыць фонд індустрыялізацыі. Рабочыя пастанавілі адпрацаваць першы дзень адпачынку для стварэньня гэтага фонду і зьвярнуліся з заклікам да рабочых іншых прадпрыемстваў пасьледаваць іх прыкладу.*

# Гістарычная праверка

Мінула 10 год са дня падпісаньня Вэрсальскае згоды і можна падагуліць вынікі выканаьня ўсёй вэрсальскай практыкі. Палітыка францускага імпэрыялізму і да некаторай ступені ангельскага імпэрыялізму, якая зводзілася да таго, каб разброіць нямецкую гаспадарку і ў той-жа час выціскаць з яе сокі мільярдаў рэпарацыйнае даніны,—**паказала ўсю сваю нікчэмнасьць.** Патрэбен быў дзесятак няўдалых канфэрэнцый, захоп і эвакуацыя Рура, пагроза рэвалюцыі ў Нямеччыне, плян Дауэса і неабходнасьць замены яго плянам Юнга, **каб пераможцы згадзіліся перанесьці вылічэньні рэпарацый ад сотняў да дзесяткаў мільярдаў.**

Толькі пасьля 10 год яны згадзіліся зьнізіць агульную суму ваеннае даніны да 36 мільярдаў марак.

Але ці вырашае новы праект унутраную супярэчнасьць важнейшай заблытанай рэпарацыйнай праблемы, якая вырасла на вэрсальскай глебе? Зусім не. Каб плаціць, Нямеччына прымушана шалёным тэмпам фарсіраваць свой экспарт. Між тым суперніцтва на сусьветных рынках набывае самыя сур'ёзныя формы і ў былых саюзных краінах усё часьцей чутны крыкі аб нямецкай канкурэнцыі. Нямецкая буржуазія, шляхам бязьлітаснай эксплёатацыі сваёй высока-кваліфікаванай рабочай сілы, скарыстаньня шырокіх навуковатэхнічных кадраў, старых звычак і гандлёвых сувязяй зноў заняла адно з першых месц у радзе індустрыяльных капіталістычных дзяржаў. Але іменна з гэтай прычыны ўзьніклі глыбокія супярэчнасьці паміж ёю і былымі саюзьнікамі. Яшчэ больш глыбокія і небясьпечныя антаганізмы вырасьлі за мінулы пэрыяд у лягэры былых саюзных дзяржаў.

Згладжаныя крыху па парыскай мірнай канфэрэнцыі англа-амэрыканскія разгалосьсі, у апошні час хуткім тэмпам перарастаюць у пагрозу нябывалае па сваіх разьмерах ваеннае сутычкі. Ужо кожны з былых саюзьнікаў вярбуе сабе прыхільнікаў для будучае сутычкі. Высьцігі ўзброеньняў ва ўзім сьвеце набываюць ліхаманкавы характар. Пасьля 6 сэсіі падрыхтоўчае камісіі гадамі праектуемае канфэрэнцыі па разбраеньні фактычна сышліся на тым, што сухаземнае ўзброеньне не павінна быць абмежавана, а з морскім узброеньнем трэба яшчэ пачакаць пакуль буйныя морскія дзяржавы самі дагаворацца паміж сабою.

Аб пэрспэктывах падобных перагавораў, пра якія цяпер так прыгожа гавораць Макдональд, сьведчыць банкруцтва на практыцы абмежаваных мер, выпрацаваных на вашынгтонскай канфэрэнцыі і ганебны правал канфэрэнцыі морскіх дзяржаў у Жэнэве ў 1927 годзе. Ня лепш стаіць справа «з вырашэньнем нацыянальных супярэчнасьцяй» унутры паасобных дзяржаў па Вэрсальскім мэтаду. **Дзесяты год вэрсальскае сыстэмы адзначыўся украінскімі і яўрэйскімі пагромамі, працэсам беларускае Грамады ў Польшчы, крывавымі сутычкамі паміж сэрбамі і харватамі ў Паўднёвай Славіі, дзікімі рэпрэсіямі супроць русінаў у Чэхаславакіі, рэзкімі нацыянальнымі канфліктамі ва ўсіх гэтых новых дзяржаўных утварэньнях, выкраеных закройшчыкамі з Вэрсалю.**

Яшчэ больш гвалтоўную сыстэму легалізавала Вэрсальская згода ў выглядзе мандатаў. Рабаўнікі-пераможцы на блянках Лігі Нацый самі сабе выпісалі мандаты на рэквізіцыю цэлых краін і народаў. **Крывавае задушэньне паўстаньняў калёніяльных народаў у Сірыі, бамбардыроўка мірных паселішч у Іраку, зьверскае зьнішчэньне ангельскімі і францускімі імпэрыялістымі тубыльцаў у падмандатных тэрыторыях у Афрыцы,**—вось плёны гэтай драпежніцкай сыстэмы. Такія-ж мэтады разьюшаныя імпэрыялістыя праводзілі ва ўсёй сваёй калёніяльнай палітыцы: Амрысарскія і Бамбейскія расстрэлы ў Індыі, Ван-сянскія і Шанхайскія расправы ў Кітаі, карныя экспэдыцыі ў Мароко.

«Сучасныя дагаворы,—павінен быў в асаблівых шавіністычных меркаваньняў прызнаць адзін з аўтараў Вэрсальскае згоды, былы італьянскі міністр Ніці,—пагражаюць пагібельню пераможцам і пераможаным. Ня мір яны стварылі ў Эўропе, а становішча вайны і гвалту. І заўтра яны стануць грозным абвінаваўчым актам, які сёньняшні пераможаны будзе прад'яўлен сёньняшнім пераможцам».

Буржуазны дыплёмат мае на ўвазе шавіністычныя ідэі рэваншу. Ён забывае пра іншыя сілы, якія кінуць у сьмяцьцёвую скрыню гісторыі Вэрсальскую згоду з усімі яе надбудовамі і скончаць з усёй яе парадзіўшай рабаўніцкай барбарскай сыстэмай. Ні крывадушная фальшывая «хартыя працы» Вэрсальскага мірнага дагавору, ні стараньні Альбэра Тома і ўсёй меншавікай кампаніі ў бюро працы пры Лізе Нацый, ні белы тэрар не маглі затрымаць клясавае барацьбы ў Эўропе і ва ўсім сьвеце.

**10-я гадавіна Вэрсалю праходзіць на фоне вялізнага абастраньня ўнутраных клясавых і міжнародна-імпэрыялістычных супярэчнасьцяй,** на фоне падрыхтоўкі ваеннага нападу імпэрыялістычнага СССР. Але за 10 год пасьля Вэрсалю і наперакор Вэрсалю і міжнароднаму рафармізму вырас магутны Савецкі Саюз—апора ўсіх сіл, што змагаюцца супроць сусьветнага імпэрыялізму.

**Міжнародны пралетарыят, дзэзарганізаваны і ашуканы ў вэрсальскія дні, загартаваўся ў вялікіх бойках і выкаваў сабе магутную і пэўную зброю барацьбы —Камуністычны Інтэрнацыянал, які не абміне гістарычна спрыяючых абставін для апошняга і рашучага бою.** («Правда»).

## На абарону індыйскіх рэвалюцыянэраў

ЛЁНДАН, 25. У Англіі распачата шырокая кампанія па абароне індыйскіх рэвалюцыянэраў, што сядзяць зараз на лаўцы падсудных у Міруце. Створан агульна-ангельскі камітэт абароны Міруцкіх абвінавачаных. Што-дня на ўсёй краіне праходзяць мітынгі, на якіх выносяцца рэзалюцыі з патрабаваньнем вызваленьня індыйскіх рэвалюцыянэраў, або перадачы іх справы суду прысяжных. Ініцыятары кампаніі абароны індыйскіх рэвалюцыянэраў зьвярнуліся да раду дэпутатаў парляманту ад незалежнай рабочай партыі з прапановаю далучыцца да руху і ўвайсьці ў камітэт. Атрыманыя дагаворы ад гэтуль адказы надзвычайна пазітыўныя.

* * *

ЛЁНДАН, 25. Рэвалюцыйны саюз бамбейскіх тэкстыльшчыкаў—«Гірні Камгар» (Чырвоны сьцяг) паслаў ангельскаму пром'еру Макдональду тэлеграму, заклікаючы яго не зацьвярджаць новых загадаў супроць забастовачных пікетаў, якія ў бліжэйшы час мае выдаць англа-індыйскі ўрад.

# Басэйны для працоўных



Былыя імпэратарскія купальні ў Дзіцячым Сяле зараз адрамантаваны і перароблены ў басэйны для плаваньня. Тут адбываюцца ўсе спаборніцтвы па плаваньні паміж спортклюбамі.

## Крывавыя сутычкі беларускіх сялян з паліцыяй

ВІЛЬНЯ, 27. У вёсцы Рацэвічы, Віленскага ваяводзтва, адбыліся крывавыя сутычкі беларускіх сялян з паліцыяй. Перад сутычкамі быў мітынг, арганізаваны дэпутатам сойму, членам беларускага рабоча-сялянскага клюбу Валынцом. На мітынг прышлі сяляне з беларускіх вакольных сёл. Агульная колькасьць удзельнікаў мітынгу дасягла некалькіх тысяч чалавек.

Калі Валынец пачаў прамову, адзін з паліцэйскіх пачаў разганяць сялян, а потым стрэліў з рэвальвэру і параніў беларуса Вараневіча. Натоўп накінуўся на паліцэйскага, разброіў яго і хацеў расправіцца з ім судом Лінча. Падасьпеў атрад паліцыі, які са зброяй у руках разагнаў натоўп сялян. Узбутаваныя сяляне хутка сабраліся ў другім канцы вёскі, але ўсё-ж іх паліцыя разагнала. Паранены беларус Вараневіч накіраваны ў шпіталь.

### Арышты мапалетніх за „камуністычную прапаганду“

ВІЛЬНЯ, 27. Ў Вільні на урачыстай вечарыне з прычыны істнаваньня 10-ае гадавіны яўрэйскага асьветнага камітэту было раскідана шмат камуністычных адозваў. Паліцыя лічыць, што гэта справа яўрэйскае моладзі і арыштавала некалькі малалетніх хлопцаў.

### Сяляне не прызнаюць польскае валюты

ВІЛЬНЯ, 26. Камунальныя касы Віленскага ваяводзтва зьвярнуліся да міністэрства фінансаў з просьбаю дазволіць вядзеньне разрахунку з сялянамі ў залатых рублёх у сувязі з тым, што падобныя разрахункі сярод сялян вельмі пашыраны.

## Адстаўка ангельскага вярхоўнага камісара ў Эгіпце

### КАНДЫДАТУРА «РАБОЧАГА» ЛЁРДА

ЛЁНДАН, 26. Ангельскі вярхоўны камісар у Эгіпце лёрд Лёйд падаў у адстаўку. Як паведамляюць газэты, адстаўка будзе прынята ўрадам.

Кандыдатам на пасаду вярхоўнага камісара Англіі ў Эгіпце называюць былога міністра па справах Індыі ў першым габінэце Макдональда лёрда Олівэра.

Афіцыйнае паведамленьне аб адстаўцы лёрда Лёйда будзе апублікавана толькі пасьля звароту ў Эгіпэт эгіпецкага караля Фуада з яго падарожжа ў Эўропу.

Адстаўка Лёйда зьяўляецца вялікай падзеяй у замежнай палітыцы Англіі, бо ў яго руках сканцэнтраваны ніткі брытанскае палітыкі на ўсім бліжэйшым Усходзе.

## Падрыхтоўка да міжнароднага чырвонага дня

### СКЛІКАНЬНЕ РАБОЧА-СЯЛЯНСКАГА ЗЬЕЗДУ ВА ФРАНЦЫІ

ПАРЫЖ, 25. Сакратарыят арганізацыі францускай кампартыі Парыскае акругі апублікаваў адозву да працоўных мас акругі, у якой заклікае іх прыняць удзел у рабоча-сялянскім зьезьдзе, назначаным на 14-га ліпеня.

Гэты зьезд павінен зьявіцца арганізаваным выражэньнем нездавальненьня працоўных мас Парыскае акругі у выніку рацыяналізацыі, паліцэйскіх рэпрэсій і г. д. Адозва зазначае, што гэты зьезд павінен прайсьці пад знакам барацьбы супроць трэстаў мэталёвае прамысловасьці, якія падрыхтоўваюць новую імпэрыялістычную вайну, а таксама павінен быць падрыхтоўчым этапам на шляху да дня 1-га жніўня.

### АБ'ЯДНАЦЬ РАБОЧЫХ У ДЗЕНЬ 15-й ГАДАВІНЫ ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНАЕ ВАЙНЫ

ПАРЫЖ, 27. 7-мы зьезд саюзу мэталістых Парыскага раёну, які адбыўся 23 і 24 чэрвеня, ухваліў рэзалюцыю, у якой сьцьвярджае сваю поўную салідарнасьць з унітарнай фэдэрацыяй мэталістых у адносінах арганізацыі міжнароднага анты-ваеннага дня 1-га жніўня.

Рэзалюцыя ўхваляе ініцыятыву Камінтэрну да аб'яднаньня рабочых усяго сьвету ў дзень 15-й гадавіны імпэрыялістычнае вайны ў магутную міжнародную дэманстрацыю. Дэлегаты зьезду абавязаліся актыўна працаваць для пасьпяховага правядзеньня дня 1-га жніўня і прыняць удзел у падрыхтоўцы да яго.

## Японія баіцца ўзмацненьня амэрыканскага ўплыву ў Кітаі

ТОКІЁ, 27. «Токіё Асахі» прысьвячае перадавіцу праекту кітайска-амэрыканскае авіяцыйнае згоды. Праект прадугледжвае арганізацыю супольнага кітайска-амэрыканскага таварыства, якому прадастаўляецца манапольнае права абслугоўваньня шляхоў зносін Кітаю.

Гэта згода, па думцы газэты, сьведчыць аб значным павялічэньні эканамічнага ўплыву Амэрыкі ў Кітаі. «Гэтаму посьпеху,—піша газэта, амэрыканцы павінны быць удзячны толькі кітайскай палітыцы ўраду Танака, які казаў, што будзе ўзмацняць эканамічны ўплыў Японіі ў Кітаі, аднак, на справе паслабіў яго».

# У рэпарацыйным тупіку

## Чарговая дыплёматычная канфэрэнцыя

### Францыя ня хоча ўступаць Англіі кіраўніцтва канфэрэнцыяй

### ВОДГУКІ АНГЕЛЬСКАГА ДРУКУ

ЛЁНДАН, 27. «Таймс» у перадавіцы выказвае думку, што надыходзячая палітычная канфэрэнцыя па рэпарацыйным пытаньні, як відаць, будзе скліканa ў Лёндане. «Дэйлі Гэральд» піша ў перадавіцы, што, калі канфэрэнцыя будзе склікана ня ў Лёндане, дык скліканьне яе, вядома, зацягнецца, а між тым,—піша газэта,—часу засталося мала».

«Таймс» напамінае, што Вэрсальская згода дакладна прадугледжвае права Францыі на эксплёатацыю саарскіх капальняў да 1935 году ў якасьці кампэнсацыі за зруйнаваныя ў часе вайны францускія вугальныя капальні.

«Усякая зьмена гэтае ўмовы,—піша газэта,—патрабуе зьмены вэрсальскае згоды, для чаго патрэбна папярэдняя згода ўсіх яе ўдзельнікаў.

### ФРАНЦЫЯ СУПРОЦЬ СКЛІКАНЬНЯ КАНФЭРЭНЦЫІ Ў ЛЁНДАЕ

ПАРЫЖ, 27. У апошнія дні афіцыёзны францускі друк рэзка зьмяніў сваю лінію і зазначае, што нельга дамагацца тэрміновага скліканьня палітычнай канфэрэнцыі па рэпарацыйным пытаньні. Паводле слоў афіцыёзнага друку, перад скліканьнем гэтай канфэрэнцыі павінна адбыцца ратыфікацыя францускіх даўгоў, прычым, спрэчкі па гэтым пытаньні за францускай палаце могуць зацягнуцца да канца ліпеня.

«Тан» зазначае на неабходнасьць перанесьці канфэрэнцыю на першую палову жніўня. Афіцыёзны друк падтрымлівае заяву Пуанкарэ на пасяджэньні замежнай і фінансавай камісіі палаты аб тым, «што няма ніякіх падстаў уступаць вымаганьням ангельскага ўраду адносна скліканьня канфэрэнцыі ў Лёндане, паколькі францускі ўрад з тым-жа правам мог-бы вымагаць скліканьня канфэрэнцыі ў Парыжы, але згаджаецца склікаць яе ў нейтральнай Швайцарыі».

Афіцыёзны друк падкрэсьлівае, што Францыя, як найбольш зацікаўлены бок у пытаньнях аб эвакуацыі рэйнскае вобласьці і рэпарацыях, ня можа ўступіць Макдональду кіраўніцтва канфэрэнцыяй.

### НАДЫХОДЗЯЦЬ ПЛАЦЯЖЫ АМЭРЫЦЫ

ПАРЫЖ, 27. Даклад Пуанкарэ па пытаньні аб даўговых згодах Францыі на аб'яднаным пасяджэньні фінансавай і замежнай камісіі палаты працягваецца ўжо 5-ты дзень. Пуанкарэ патрабуе ратыфікаваць гэтыя згоды да 1-га жніўня, з тэй прычыны, што ў супраціўным выпадку Амэрыка ня згодзіцца адтэрмінаваць належнага ёй да 1-га жніўня плацяжу ў 407 мільёнаў долараў. Пры гэтым Пуанкарэ напомніў, што незадоўга да выбараў у Англіі былы ангельскі міністр фінансаў Чэрчыль папярэдзіў Францыю, што ў выпадку выплаты Амэрыцы гэтай сумы 1-га жніўня, ангельскі ўрад будзе патрабаваць адначасовай выплаты Англіі 80 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў.

Парлямацкая фракцыя радыкал-сацыялістых прыняла рэзалюцыю, якая патрабуе забесьпячэньня францускіх плацяжоў нямецкімі плацяжамі, але ўсё-ж дае зразумець, што францускі ўрад павінен ня двусэнсна згадзіцца на датэрміновую эвакуацыю рэйнскае вобласьці, як на яўхільную прадпасылку прыняцьця Нямеччынай пляну Юнга без чаго Францыя ня можа ўзяць на сябе абавязацельства выплачваць свае даўгі саюзьнікам.

### ФРАНЦЫЯ ПРОСІЦЬ АДТЭРМІНОЎКІ.

ПАРЫЖ, 27. Агэнцтва Гавас паведамляе:

«На паседжаньні палаты дэпутатаў Пуанкарэ патрабаваў адтэрмінаваньня адказаў па пытаньні аб даўгох і рэпарацыях. Франклен Буйён пратэставаў і патрабаваў адкрыцьця спрэчак, у выніку якіх парлямант запрапануе ўраду пачаць перагаворы з ПАЗШ аб адтэрмінаваньні плацяжоў.

«Вы ведаеце, заявіў Пуанкарэ ў адказ, што нам было адмоўлена ў адтэрміноўцы, якую мы прасілі. Я заўтра аднаўлю перагаворы, паведаміўшы нашага прадстаўніка ў Вашынгтоне, што я стаю тварам да твару з палатай, якая, па-мойму, аднадушна».

Паседжаньне палаты адкладаецца да 10 гадз. вечара для таго, каб даць магчымасьці камісіям абгаварыць наступную рэзалюцыю Франклен Буйёна:

«Палата дэпутатаў, дзякуючы наліччу новага фактару, як плян Юнга, дае ўраду паўнамоцтвы ўжыць неабходныя крокі для таго, каб дабіцца адтэрміноўкі асноўных плацяжоў да 31-га жніўня, ня спыняючы часовых плацяжоў, якія выплачваюцца ўжо на працягу двух год».

* * *

ПАРЫЖ, 27. Агэнцтва Гавас паведамляе: «Палата прыняла рэзалюцыю Франклен Буёна з незначнымі зьменамі, унесенымі са згоды ўраду фінансавай камісіяй».

## Пад ёлкаю

У памяць нарады Макдональда і Даўэса аб морскіх разброеньнях пасаджана ёлка ў садзе г. Форэса.

ВАРОНА (**анёлу міра**):—**Ну, вось і ёлачку пасадзілі.** Хутка, значыць, ваяваць будуць...

## Новая процісавецкая дэманстрацыя ў Дзьвінску

ВІЛЬНЯ, 26. Як паведамляе «Кур. Віл.», на прыкладу мінулага году 22-23 чэрвеня ў Дзьвінску адбылася ўрачыстасьць на ўпамін польскіх жаўнераў, якія загінулі пад Дзьвінскам у 1919 г. падчас барацьбы з Чырвонай арміяй. У 11 гадзін адбылося жалобнае набажэньства над брацкаю магілаю латвійскіх жаўнераў, а ў тры гадзіны дня—над магілаю польскіх жаўнераў. Выступалі з прамовамі: б. вайсковы міністр Латвіі, а цяпер камэндант Дзьвінскага гарнізону гэн. Бангэрскі, старшыня Дзьвінскае меставае рады Крумін, намесьнік старшыні саюзу палякаў Латвіі Лацэвіч, польскі консул у Дзьвінску Сьвежбінскі і польскі пасол у Латвіі Арцішэўскі. Прамова апошняга была асабліва багата процісавецкімі выпадамі. Арцішэўскі асабліва падкрэсьліваў, што Польшча ў 1919-20 г. выратавала эўрапэйскую цывілізацыю і што ў будучыне таксама Латвія—павінна ісьці разам з Польшчаю.

Вечарам адбыўся банкет, наладжаны Дзьвінскім аддзелам таварыства польска-літвійскага зблiжэньня. На банкеце Арцішэўскі сказаў яшчэ адну прамову, у якой адзначыў вартасьць працы над зблiжэньнем Латвіі і Польшчы.

## Плян Юнга ў дзеяньні




### У ФАШЫСЦКАЙ ПОЛЬШЧЫ

## Працэс былога міністра Чэховіча

### ЛІБЭРМАН ЛАШЧЫЦЦА ПЕРАД ПІЛСУДЗКІМ—«ППС У РОЛІ ПАКІНУТАЕ КАХАНКІ»

ВАРШАВА, 27. Пасьля допыту сьведак у дзяржаўным трыбунале, дзе слухаецца справа былога міністра фінансаў Чэховіча (якога сойм перадаў суду за незаконнае выдатканьне дзяржаўных сродкаў звыш бюджэту), з абвінаваўчай прамоваю выступіў прадстаўнік абвінавачаньня, пэпэсавец Лібэрман.

Пілсудзкі ўчора ў сваёй прамове кінуў на адрасу Лібэрмана абвінавачаньне, што ў яго «сьмярдзяць рукі». Гэта, аднак, не пашкодзіла Лібэрману заявіць сёньня ў сваёй прамове, што Пілсудзкі зьяўляецца «ідэёвым і вялікім чалавекам, якога паслалі Польшчы нейкія вышэйшыя сілы». Лібэрман заявіў, што нікому ў Польшчы не магла зьявіцца ў галаве думка асудзіць Пілсудзкага, якога можа судзіць толькі гісторыя і будучае пакаленьне. Лібэрман нападаў, галоўным чынам, на Чэховіча, высоўваючы пункт гледжаньня, што «тое, што дазволена Пілсудзкаму, ня можа быць дазволена Чэховічу».

Аргумэнтацыя Лібэрмана, якая заключаецца ў тым, што Чэховіч павінен змагацца з Пілсудзкім у той час, як увесь сойм (у тым ліку і яго партыя) рабіць гэта баіцца, зрабіла вельмі адмоўнае ўражаньне ў залі суду.

Адпаведны адказ атрымаў Лібэрман у першых-жа словах абаронцы Чэховіча—Асхальскага Асхальскі заяўляе, што апазыцыйнасьць ППС пагадзае помсту пакінутае каханкі, якая стаіць у папярэднім пакоі і прапануе сваё каханьне. Асхальскі падкрэсьлівае, што ППС перайшла ў апазыцыю ў той момант, калі ў яе не засталося ніякіх сумненьняў у тым, што яе паслугі канчаткова адхілены ўрадам. У залі суду ад членаў ураду прысутнічаў толькі міністр юстыцыі.

### НОВЫЯ АРЫШТЫ УКРАІНСКІХ ВУЧНЯЎ

ВАРШАВА, 26. У Львове 25-га чэрвеня на Лычыкаўскіх могілках адбыліся публічныя панікіды над магіламі расстрэляных студэнтаў гімназістаў украінцаў. На панікідах прысутнічала некалькі тысяч украінскіх вучняў і вучаніц.

Паліцыя скапіскавала ўзложаныя на магілы вянкі і арыштавала 17 вучняў і вучаніц («Газ. Варш.»).

### ПОЛЬСКІ СУД ЗЬДЗЕКУЕЦЦА З БЕСПРАЦОЎНЫХ

ВАРШАВА, 25. Усё часьцей і часьцей падаюцца ў газэтах весткі аб самазабойствах беспрацоўных рабочых. «Гас. Правды» паведамляе, што беспрацоўная работніца К. Адамская, ня маючы з чаго жыць, прабавала пакончыць з сабою і сваім 9-ці гадовым сынам, кінуўшыся з ім пад поезд, але абое былі выратаваны чыгуначнікамі. Выкліканая паліцыя арыштавала Адамскую. Седзячы ў турме, Адамская з мэтамі самазабойства некалькі раней глытала шпількі. Нарэшце адбыўся суд, які засудзіў яе за спробу забойства сына на 10 месяцаў турмы.

### ЗА АБРАЗУ ПІЛСУДЗКАГА.

ВАРШАВА, 25. Акружны суд у Лешне засудзіў настаўніцу пачатковае школы ў Забарове Мартынаву на 30 дзён арышту, а яе мужа—інваліда на 10 дзён за зазочную абразу Пілсудзкага. («Гл. Пр.»).

## Фын Юй-сян выяжджае за граніцу

ПЭЙПІН, 27. Чан Кай-шы ў інтэрвю з прадстаўнікамі кітайскага і замежнага друку, гаворачы пра Фын Юй-сяна сказаў, што ўрад, бяручы пад увагу заслугі Фын Юй-сяна ў мінулым, пастанавіў скасаваць нядаўна выпушчаны загад аб яго арышце і назначыў яго вярхоўным камісарам па вывучэньні прамысловасьці Эўропы і Амэрыкі.

Праз тыдзень Фынь Юй-сян выедзе за граніцу. Чан Кай-шы выказаў упэўненасьць, што Ён Сі-шан будзе дапамагаць нацыянальнаму ўраду для заканчэньня спраў нацыянальнае рэвалюцыі.

* * *

ПЭЙПІН, 27. У Пэйпіне прыехалі генэралы Юн Сі-гуй і Чу Су-гуан. Яны заяўляюць, што Ен Сі-шан адмовіўся перагледзіць сваю думку аб ад'езьдзе за граніцу. Агэнцтва Фуган паведамляе, што тры члены нацыянальнага ўраду, тэрмінова выехалі ў Шансі з мэтаю угаварыць Ен Сі-шана адмовіцца ад падарожжа за граніцу.

## Сьвяткаваньні працы

23-га чэрвеня ў Маскве адбылася сувязь студэнтаў і навуковых працаўнікоў з рабочымі на Вараб'ёвых горах.

На здымку: селянін Курскае акругі Цэнтральна-чорназемнае вобласьці, член Цэнтральнага Савету Т-ва «Прэч няпісьменнасьць» тав. Расьлякоў вітае студэнтаў.

## Парадак разгляду скаргаў па чыстцы савецкага апарату

МАСКВА, 27. Зьнятыя мясцовымі РСІ ў парадку чысткі савецкага апарату (да выданьня інструкцыі) накіроўваюцца для абскарджаньня пастаноў мясцовых РСІ у Маскву ў НК РСІ РСФСР, разьлічваючы пры гэтым адразу-ж атрымаць канчатковае вырашэньне свайго пытаньня па прадстаўленых ім даных, якія часта складаюцца з аднэй заявы.

Цэнтральная камісія па чыстцы савецкага апарату, ня маючы ў сваім распараджэньні матар'ялаў аб прычынах па якіх быў вычышчаны служачы, ня можа выносіць пастановы на падставе матар'ялу, прадстаўленага вычышчаным, без адпаведных даных ад мясцовых РСІ.

У сувязі з тым, што прысылка апошніх патрабуе пэўнага пэрыяду часу,—уся маса прыехаўшых, патраціўшыся на праезд, пражыцьцё ў Маскве і г. д., прымушана ехаць назад бяз вынікаў.

1. Згодна інструкцыі парадак абскарджаньня наступны: а) пастанова камісіі па чыстцы ў адносінах асоб, вычышчаных па другой і трэцяй катэгорыі, можа быць абскарджана ў адпаведную мясцовую РСІ, пастанова якіх зьяўляецца канчатковай; б) пастановы камісій па праверцы і чыстцы ў адносінах асоб, залічаных у першую катэгорыю, могуць быць абскарджаны гэтымі асобамі ў адпаведныя вышэйшыя камісіі па чыстцы (на пастановы акруговых і вобласную), пастановы якіх зьяўляюцца канчатковымі, в) НК РСІ Саюзу і Саюзных рэспублік пакідаюць за сабою права ў парадку нагляду пераглядаць пастановы нижэйшых РСІ.

2. Тыя, хто хоча абскардзіць сваё пытаньне ў цэнтральную камісію могуць накіраваць свае скаргі праз пошту. Тыя, хто падае сваю скаргу асабіста (выездам) ня мае ніякіх пераваг пэрад тым, хто прыслаў сваю скаргу праз пошту. Вызначаны парадак разгляду скаргаў у абодвых выпадках аднолькавы на падставе строга праверваных дакумантальных даных розьніца толькі ў тым, што ў першым выпадку той, хто падаў скаргу, нясе матар'яльную страту (праезд і г. д.).

Усякі, хто падае скаргу, павінен разам з ёю падаць пацьвярджаючыя дакумантальныя даныя. Аб выніках разгледжанае паданае скаргі кожны будзе своячасова паведамлены, згодна паказанаму ім адрасу.

**Цэнтральная камісія па чыстцы савецкага апарату.**

## Аслабаньне т. Томскага ад абавязкаў члена СПА

МАСКВА, 28. СНК СССР настанавіў: «Аслабаніць т. Томскага ад абавязкаў члена Савету Працы і Абароны і назначыць членам СПА т. Акулава».

## Адозва Гіндэнбурга з поваду 10-годзьдзя Вэрсалю

БЭРЛІН, 28. Агэнцтва Вольфа паведамляе аб адозве нямецкага прэзыдэнта і нямецкага ўраду да нямецкага народу, у якой між іншым зазначаецца:

«Сёньнешні дзень зьяўляецца жалобным днем. 10 год прайшло з таго часу, калі прадстаўнікі Нямеччыны, што ўдзельнічалі ў мірных перагаворах, былі прымушаны даць свой подпіс пад дакумантам, які глыбока расчараваў усіх сапраўдных прыяцеляў справядлівага і сапраўднага міру.

На працягу 10 год усе пласты нямецкага народу нясуць цяжар згоды. Мы аднадушны з усімі немцамі ў адхіленьні сьцьверджаньня, што Нямеччына адзіна вінаватая ў вайне, і цьвёрда пераконаны, што будучае належыць тым ідэям сапраўднага міру, якія грунтуюцца не на дыктатуры, а на сумленным пераконаньні свабодных роўнапраўных народаў».

## КОНТР-ДЭМАНСТРАЦЫІ КАМПАРТЫІ Ў БЭРЛІНЕ

БЭРЛІН, 26. У процівагу вялікім дэманстрацыям, што арганізуюцца 28 чэрвеня (дзесятая гадавіна падпісаньня Вэрсальскае згоды) фашысцкімі, нацыяналісцкімі, а таксама сацыял-дэмакратычнымі арганізацыямі, кампартыя арганізуе ў Бэрліне вялікую антываенную контр-дэманстрацыю.

## Працэс 35 турэцкіх рэвалюцыянэраў

КАНСТАНТЫНОПАЛЬ, 27. Суд у Сьмірне разглядае працэс 35 турэцкіх рэвалюцыянэраў. Абвінавачаньне прад'яўлена на 147 артыкуле, які прадугледжвае кару сьмерці. Абвінаваўчы акт прыпісвае настаўніку Ахмэду Кайя кіраўніцтва арганізацыяй у Сьмірне, а Лазу Ізмаілу—складаньне камуністычных адозваў і выданьне падпольнае камуністычнае газэты. Допыт прайшлі 18 абвінавачаных. Усе абвінавачаньня адмовіліся ад сваіх ранейшых паказаньняў і ад прыналежнасьці да патаемнае арганізацыі. Лаз Ізмаіл, адмаўляючыся ад удзелу ў патаемнай арганізацыі, заявіў: «Я рэвалюцыянэр, выхадзец з рабочае клясы і актыўна ўдзельнічаў у камуністычным руху».

У час папярэдняга сьледзтва Ізмаіла так цяжка зьбіла паліцыя, што яму ў больніцы павінны былі зрабіць опэрацыю.

## У Японіі загінулі 42 вуглякопы

ТОКІЁ, 28. На каменнавугольных рудніках Мацухіма ў прэфэктуры Нагасакі, капальня, якая знаходзілася пад морскім дном, ад невядомае прычыны абвалілася. 42 гарнякі загінулі. Капальня цалкам разбурана.

## Зьезд швэдзкіх горнарабочых

### Сацыял-дэмакраты хочуць раскалоць прафрух.—Буржуазія вітае сацыял-здраднікаў

СТОКГОЛЬМ, 28. Адкрыўся зьезд швэдзкіх гарнякоў. Галоўныя пытаньні, што стаялі на парадку дня, адносіны да савецкіх гарнякоў і адзінства прафруху. ЦК гарнякоў запрапанаваў уключыць у склад прэзыдыуму і ва ўсе камісіі таксама і камуністых. Пасьля націску цэнтральнага савету прафсаюзаў, сацыял-дэмакратычная фракцыя зьезду дабілася адхіленьня кандыдацкіх сьпісаў ЦК большасьцю 29 галасоў супроць 27. У тым ліку былі адхілены і сацыял-дэмакратычныя кандыдатуры з ліку прыхільнікаў захаваньня адзінства прафруху. Замест гэтага сацдэмакраты правялі ў прэзыдыум і ў камісіі прыхільнікаў разрыву з савецкімі гарнякамі.

З кароткім прывітальным словам на зьезьдзе выступіў старшыня саюзу горнарабочых СССР—т. Шварц. Другі дзень зьезду быў заняты жорсткімі дэбатамі па справаздачы ЦК. Многія прамоўцы рэзка крытыкавалі здраднікоў дзейнасьць цэнтральнага савету прафсаюзаў у час леташніх забастовак. Вялікае абурэньне выклікаў выкрыты на зьезьдзе факт прадастаўленьня цэнтральным саветам пазыкі ЦК гарнякоў пры ўмове перадачы савету ўсёй перапіскі з савецкімі гарнякамі.

У рэзалюцыі па справаздачы ЦК, сацыял-дэмакраты ўключылі пункт, у якім не ўхваляюць дзейнасьць ЦК у пытаньні аб сувязі з Савецкім Саюзам гарнякоў, хоць самае пытаньне аб адносінах з Савецкім Саюзам горнарабочых яшчэ не абгаварваўся. Гэта рэзалюцыя прынята большасьцю 30 галасоў супроць 27. Вынік спрэчак, якія началіся яшчэ ўчора, аб адносінах да савецкіх гарнякоў такім чынам ня вырашан.

Буржуазная газэта «Стокгольм Бладэт» вітае сацыял-дэмакратаў за атаку на камуністых і смакуе разрыў з Савецкім Саюзам горнарабочых.

# Па Савецкім Саюзе

## Фонд рабочае асьветы

МАСКВА, 27. Дзяржплян СССР і ЎсеЦСПС пастанавілі стварыць, пачынаючы з 1929-30 г. спэцыяльны фонд рабочае асьветы, які прызначаецца на масавае ўцягненьне дзяцей рабочых у школу 2-й ступені і ва ўстановы дашкольнага выхаваньня. Сродкі фонду будуць скарыстаны для выдачы вучням вопраткі, абутку, стыпэндыі, забесьпячэньня жыльлём і г. д. Паводле падлікаў дзяржпляну, фонд рабочае асьветы ў 1929-30 г. будзе складаць 123 мільёны рублёў.

## Астраханскі ўрок

МАСКВА, Па-зачарговы пленум ЦК саюзу харчавікоў заслухаў даклад аб выніках абсьледваньня падзей у Астрахані. У спрэчках па гэтым дакладу выступіў член прэзыдыуму ЎсеЦСПС Тав. Вайнбэрг, які адзначыў, што астраханскі урок сьпіналізуе аб небясьпецы, якая магчыма ёсьць і ў інш

## ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

# Генэральная праверка і чыстка партыйных радоў

### Выкідаючы ўсё нягоднае, чужое з сваіх радоў, партыя, пры падтрыманьні шырокіх пралетарскіх мас яшчэ больш згуртованымі радамі пойдзе да новых перамог на фронце сацыялістычнага будаўніцтва

### Пад знакам бальшавіцкай прынцыповасьці праходзіць праверка вясковых партарганізацый

## Першы праверачны сход

**(Смалявіцкая райпартарганізацыя Менскай акругі)**

Камісія па праверцы і чыстцы ячэек КП(б)Б Смалявіцкай раённай арганізацыі 22-га чэрвеня прыступіла да работы. На пасяджэньні бюро райкому КП(б)Б, прысьвечаным пытаньню чысткі, была вынесена пастанова аб тым, каб 30-га чэрвеня склікаць нараду рабселькораў для абгаварэньня пытаньняў, зьвязаных з асьвятленьнем ходу чысткі ў пасьцепгазэтах і цэнтральным друку.

23-га чэрвеня ў мястэчку адбыўся агульны адкрыты партсход з удзелам рабочых саўгасу, беспартыйнага батрацкага і серадняцкага насельніцтва. На гэтым сходзе быў зроблен даклад аб задачах і значэньні генэральнай чысткі партыі. У гэты-ж дзень была праведзена нарада сакратароў парт'ячэек, на якой распрацаваны канкрэтны плян правядзеньня чысткі па ячэйках.

На другі дзень пасьля нарады сакратароў камісія прыступіла да праверкі Смалявіцкай ячэйкі КП(б)Б. На праверачным адкрытым сходзе ячэйкі прысутнічала каля 400 чалавек. Старшыня праверачнай камісіі тав. Пыжыкаў, адкрываючы праверачны сход, яшчэ раз у сваёй уступнай прамове ў кароткіх рысах падкрэсьліў палітычныя задачы чысткі і неабходнасьць удзелу ў ёй беспартыйных працоўных мас.

Перш чым прыступіць да непасрэднай праверкі складу ячэйкі, была заслухана справаздача сакратара т. **Хацкевіча** аб становішчы і рабоце ячэйкі. Абгаварэньне гэтага дакладу прайшло надзвычайна актыўна. Удзельнікі сходу падалі больш як 50 пытаньняў. Большасьць з іх была накіравана на вырашэньне таго, як ячэйка на практыцы ажыцьцяўляла асноўныя дырэктывы партыі па рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Ня з меншай актыўнасьцю прайшло і само абгаварэньне работы ячэйкі: у спрэчках выступала каля 15 чалавек, выступаўшыя галоўным чынам падкрэсьлівалі тыя недахваты, якія былі ў рабоце ячэйкі. Між іншым у спрэчках падкрэслена што **ячэйка аддавала вельмі мала ўвагі вярбоўцы с.-гаспадарчых рабочых і батракоў у партыю.** Дрэнна кіравала работай камсамольская ячэйкі і грамадзкімі арганізацыямі.

Чужыя антысавецкія элементы, якія пазбаўлены права выбарчага голасу, прабраліся на сход з мэтай выкарыстаць чыстку партыі для дыскрэдытацыі асобных камуністых. Але яны былі хутка выяўлены і выстаўлены са сходу.

Калі на праверачным сходзе было дэтальна абмеркавана пытаньне аб рабоце і стане ячэйкі, камісія прыступіла да праверкі кожнага члена ячэйкі.

Першым правяраецца т. **Арцюшка.** Член партыі з 1925 году. Па сацыяльным становішчы батрак, зараз працуе міліцыянэрам. Сход яго сустракае надзвычайна прыхільна і дае добрую характарыстыку. За ім правяраюцца іншыя таварышы. Камісія і сход надзвычайна ўважліва і дэтальна высьвятляюць палітычны твар кожнага камуністага. Пры праверцы т. **Кулінковіча**—члена партыі з 1924 году, селяніна па сацыяльным становішчы—выступае рад таварышоў. Яны прыводзяць факты аб тым, што таварыш Кулінковіч мае за сабою рад антыпартыйных учынкаў, што ён у практычнай рабоце скажаў клясавую лінію. Кулінковіч, будучы ў свой час старшынёю сельсавету, грамадзяніну, пазбаўленаму права выбарчага голасу, даў спраўку, якая не адпавядае сапраўднасьці, для таго, каб гэты грамадзянін мог накіраваць сваіх дзяцей у навучальную ўстанову.

Першы сход Смалявіцкай ячэйкі па праверцы членаў і кандыдатаў партыі прайшоў вельмі актыўна. Трэба толькі гэту актыўнасьць забясьпечыць на далейшых праверачных сходах.

**Н. С.**

## Сьмілавіцкія партарганізацыі напярэдадні праверкі

Камісія па праверцы і чыстцы Сьмілавіцкай райпартарганізацыі прыступіла да працы з 23-га чэрвеня. Перш за ўсё камісія азнаёмілася са станам падрыхтоўкі партарганізацыі і асобных ячэек да чысткі.

Высьветлена, што інструкцыя ЦКК аб чыстцы і праверцы радоў партыі ў ячэйках не прапаравана. У сувязі з гэтым поўны час перад пачаткам непасрэднай работы па чыстцы прыдзецца аддаць справе растлумачэньня як партыйным, так і беспартыйным масам задач і парадку яе правядзеньня.

З боку райкому партыі было праведзена наступнае: на раённым сходзе партарганізацыі старшыня АКК т. Дамброўскі зрабіў даклад аб задачах чысткі, на адкрытых партсходах ячэек працаваны тэзісы тав. Яраслаўскага, а некаторых мясцох спэцыяльна праведзены сходы беднаты і сярод членаў прафсаюзу былі таксама праведзены ячэйкамі гутаркі аб чыстцы партыі.

Азнаёміўшыся са станам падрыхтоўкі камісія супольна з райпартарганізацыяй распрацавала каляндарны плян праверкі ячэек.

Каляндарны плян пабудаваны так, каб, прыступаючы да праверкі і чысткі тае ці іншае ячэйкі, камісія мела магчымасьць адзін дзень аддаць на падрыхтоўку партыйцаў і беспартыйных мас да праверачнага сходу. Члены праверачнае камісіі 23-га чэрвеня правялі нараду рабселькораў раёну па пытаньнях чысткі і гутарку в беднатой мястэчка.

А 24-га чэрвеня з гэтай-жа беднатой быў сабраны сход членаў прафсаюзу.

На нарадзе рабселькораў было завострана пытаньне аб асьвятленьні ходу чысткі ў насьценных і друкаваных цэнтральных газэтах. Камісія шырока разгортвае работу па ўвязваньні з чысткай вярбоўкай с.-г. рабочых і батракоў у партыю.

**КЛУЙША.**

## Пры ўдзеле мас

Пачалася праверка і чыстка **Койданаўскай** арганізацыі КП(б)Б. Праверку праводзіць камісія ў складзе т. т. **Жардзецкага, Каланіцкага і Андрыянава.** Перад пачаткам чысткі камісія і раённы камітэт партыі падвялі вынікі падрыхтоўчай работы. Пашыраны пленум РК КП(б)Б супольна з партыйным актывам адзначыў, што арганізацыя добра падрыхтавалася да чысткі.

Пастановы лістападаўскага пленуму ЦК УсеКП(б) і XII зьезду КП(б)Б аб чыстцы радоў партыі прапрацаваны па ўсіх ячэйках.

Вялікая работа праведзена сярод бядняцка - серадняцкага насельніцтва па растлумачэньні палітычных задач чысткі.

Радавая партыйная маса і працоўнае насельніцтва ў асноўным усьвядомілі клясавыя ідэёва - арганізацыйныя прычыны чысткі.

25-га чэрвеня ў **Койданаве** адбыўся першы праверачны сход па чыстцы мястачковай ячэйкі КП(б)Б. Сход прайшоў пры актыўным удзеле беспартыйных рабочых, батракоў, беднаты і серадняцтва. На сходзе прысутнічала звыш 500 беспартыйных. Беспартыйныя сяляне і батракі прынялі ўдзел у выступленьнях.

**ЛЬВОЎ.**

## Праверка кіруючых кадраў

**(ПОЛАЦАК)**

Камісія ў складзе т. т. Рыскіна, Дамброўскага і Шлока 24 чэрвеня на адкрытым куставым сходзе парт'ячэек праводзіла праверку кіруючых кадраў.

Правяраліся т. т. **Бадуноў**—рабочы чыгуначнік, член партыі з 1924 г., **Бачманаў**—член бюро акруткому партыі, **Зяньковіч**—член ЦКК КП(б)Б, **Сітнікаў**—член прэзыдыуму АКК, **Фёдараў**—сакратар акруткому КП(б)Б, **Эгле** і інш.

На гэтым-жа сходзе правяраліся т. т., вылучаныя ў склад праверкомаў па чыстцы партарганізацыі. У склад праверкомаў намечаны лепшыя таварышы з арганізацыі.

## АД КАМІСІІ ЦКК УсеКП(б) ПА ПРАВЕРЦЫ КІРУЮЧАГА СКЛАДУ

Праверку членаў і кандыдатаў ЦК і членаў ЦКК, а таксама бюро АК і прэзыдыуму АКК **Аршанскай арганізацыі** праводзіць камісія ЦКК УсеКП(б)Б у складзе: т. т:**Рыськін, А. Б.** (старшыня), член партыі з 1915 г., рабочы, член прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б.

**Дамброўскі, А. К.** (член камісіі) — у партыі з 1909 г., рабочы, член прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б.

**Шлок, Ф. І.** (член камісіі)—у партыі в 1919 г., рабочы Заходн. чыг., член ЦКК УсеКП(б).

Камісія зьвяртаецца да ўсіх членаў і кандыдатаў партыі, да ўсіх рабочых з просьбай прыняць актыўны ўдзел у правядзімай камісіяй рабоце шляхам удзелу на сходах ячэек, падачы пісьмовых і вусных заяў членам камісіі аб тых ці іншых таварышох, якія падлягаюць праверцы.

Заявы (пісьмовыя і вусныя) прымаюцца членамі камісіі штодзенна з 9 гадзін раніцы да 3-х гадзін дня да 1-га ліпеня г. г. у памяшканьні АКК КП(б(Б (дом саюзаў).

## Камісія па чыстцы кіруючага складу

**СЬПІС, ЧАС І МЕСЦА ПРАВЕРКІ ЧЛЕНАЎ І КАНДЫДАТАЎ ЦК, ЦКК, БЮРО АК І ПРЭЗЫДЫУМУ АКК**

**1-ы куставы сход:** 29-га чэрвеня г. г. а 6-й гадзіне ўвечары ў клюбе будаўнікоў.

**Ячэйкі:** Лесазаводу, будаўнікоў, бровару, працасьветы, акраз, ДПУ, працкалектыву гарбароў, мэталістых, друкарні. 1. Агранаўскі, 2. Бутар, 3. Зак, 4. Кавалёў, 5. Кохан, 6. Мангус, 7. Розаў, 8. Садоўскі, 9. Сэрлін, 10. Стэфановіч, 11. Сьвірыдаў, 12. Хандогі, 13. Шабун.

**2-гі куставы сход:** 30 чэрвеня г. г. а 12-й гадзіне дня ў Прыдняпроўскіх лагерах

**Ячэйкі:** вайсковыя.

1. Ананьічаў, 2. Бабкоў.

**3-ці куставы сход:** 30 чэрвеня г. г. а 6-й гадзіне ў клюбе чыгуначнікаў:

**ячэйкі:** матар'яльная, цягі, руху, заходняя, шляху, аховы. 1. Валюк. 2. Вілянстовіч, 3. Куцько, 4. Семашчук, 5. Скробут, 6. Сідаровіч.

**4-ы куставы сход:** 1-га ліпеня г. г. а 6-й гадзіне ўвечары ў мястэчку Дуброўна на фабрыцы «Дняпроўская мануфактура».

**Ячэйкі:** Усе цэхавыя, парткалектыву фабрыкі і Дубровенская савецкая ячэйка. 1. Глушэц. 2. Хэйфэц.

**5-ы куставы сход:** 1-га ліпеня г. г. а 6-й гадзіне ўвечары ў Асінбудзе—Выдрыцкі клюб.

**Ячэйкі:** Выдрыцкая, Арэхаўская і Шабаноўская. 1. Шаршнёў.

**6-ы куставы сход:** 2-га ліпеня г. г. а 6-й гадзіне ўвечары ў г. Мсьціслаўлі—прафпартклюб.

**Ячэйкі:** савецкая, прафкаапэрацыйная і тэхнікумаўская. 1. Прохараў.

**29-га чэрвеня, у 10 гадзін раніцы, зводна пастановы ЦК КП(б)Б**
*Склікаецца нарада загадчыкаў аддзелаў*

## АК КП(б)Б ПА ПРАЦЫ НА ВЁСЦЫ

**Пытаньні, якія будзе вырашаць нарада:**

*1. Аб задачах аддзелаў па працы на вёсцы.*

*2. Аб выніках гаспадарчай дапамогі беднаце і аб працы партыі сярод беднаты.*

*3. Аб становішчы сялянскіх камітэтаў узаемадапамогі і мерапрыемствах па іх узмацненьні.*

**Ад акруг апрача загадчыкаў вясковымі аддзеламі АК трэба камандыраваць: ад Бабруйскай, Аршанскай, Магілёўскай, Полацкай і Мазырскай на адным сакратару РК КП(б)Б і адным сакратару вясковых ячэк ад Менскай акругі адзін сакратар вясковай ячэйкі.**

## Праверены дзьве ячэйкі

**(ПАРТАРГАНІЗАЦЫЯ №-скага АРТПАЛКА)**

Генэральная праверка і чыстка партыі яшчэ больш згуртуе партыйныя масы вакол задач партыі, яшчэ на вышэйшую ступень падыме работу парт'ячэек і арганізацый. І зусім зразумела, што ўсебакова праверыўшы работу ячэек, кожнага камуністага, выкрыўшы ўсе недахваты, партарганізацыі будуць больш выразна і поўна выконваць асноўныя партыйныя дырэктывы.

У нашым №-скім артпалку праверка праходзіць пад знакам шырокай самакрытыкі. Партыйцы і беспартыйныя чырвонаармейскія масы актыўна ўдзельнічаюць на праверачных сходах. Аднак, ёсьць і адмоўныя моманты ў ходзе праверкі.

Першы і галоўны з іх той, што частка беспартыйнага сярэдняга камскладу ня ўдзельнічае і нават ня ходзіць на праверачныя сходы. Ёсьць асобныя камандзіры, якія яшчэ ні разу ня былі на сходах. Падругое, гэта тое, што па сходах пры выступленьні некаторых таварышоў мала канкрэтнасьці, а гавораць «наогул». Былі спробы з боку некалькіх асобных таварышоў зводзіць асабістыя рахункі. Меў месца і такі факт, калі адзін з таварышоў прабаваў душыць самакрытыку.

У партарганізацыі палка праверены ўжо 2 ячэйкі і абвешчаны вынікі праверкі праверанай ячэйкі 6-ай батарэі. З агульнае колькасьці членаў і кандыдатаў партыі, якія прайшлі праверку, адзін таварыш выключаны з партыі за п'янства і інш. антыпартыйныя ўчынкі. А двум таварышом камісія дала ўказаньне прапрацаваць пастановы 16 усесаюзнай партканфэрэнцыі.

На праверачных сходах выяўлена, што некаторыя камуністыя ячэйкі 2-ой батарэі адарваны ад мас і фармальна адносяцца да выкананьня партыйных абавязкаў.

**М. ШПІЛЕЎСКІ**

## Цэнтральнаму Камітэту КП(б)Б

III-я Міжсаюзная канфэрэнцыя Барысаўскага раёну пасылае гарачае пралетарскае прывітаньне баявому кіраўніку **Камуністычнае партыі і працоўным Беларусі—ЦК КП(б)Б.**

Канфэрэнцыя запэўнівае, што пастаўленыя задачы перад працоўнымі Барысаўшчыны па сацыялістычнай перабудове прамысловасьці ў сельскай гаспадарцы імі будуць выкананы шляхам яшчэ большага ўдзелу ў вынікоўнені сабекошту прадукцыі, зжыцьця прагулаў і ўзмацненьня сацыялістычнай працоўнай самадысцыпліны.

Канфэрэнцыя прыме ўсе меры пад кіраўніцтвам кампартыі для ўцягвання і поўнага ўдзелу працоўных у сацыялістычным спаборніцтве, што павінна забясьпечыць падняцьце прадукцыйнасьці працы, гэтага важнейшага зьвяна сацыялістычнага наступленьня.

**Няхай жыве кампартыя Беларусі і яе кіраўнік ЦК!**

**Па даручэньні канфэрэнцыі:**

**Прэзыдыум III-й Барысаўскай міжсаюзнай канфэрэнцыі прафсаюзаў.**

## Жорстка выкараняць праявы правага ўхілу

**(Заслаўская ячэйка КП(б)Б, Меншчына)**

Нядаўна адбыліся перавыбары бюро Заслаўскай ячэйкі. Гэта апошнія перавыбары перад чысткай партыі. Перавыбарчы сход прайшоў пры надзвычайнай актыўнасьці. Па справаздачы бюро выказалася 13 таварышоў. Выступаўшыя падрабязна спынядіся на ўсіх галінах работы ячэйкі, прычым выступленьні былі дзелавыя, крытыка была накіравана ў бок выяўленьня недахопаў у рабоце ячэйкі.

А недахопы ў рабоце былі, былі яны і ў справаздачы бюро ячэйкі, і выявіліся пры выступленьні некаторых таварышоў.

Першы і галоўны недахоп — гэта неразуменьне некаторымі членамі ячэйкі карэньняў правага ўхілу і яго сутнасьці. У справаздачы сакратар ячэйкі тав. **Шыгураў** гаварыў: «у ячэйцы правага ўхілу няма, але былі з боку некаторых членаў ячэйкі памылкі, дзякуючы іх пізкаму культурнаму і палітычнаму ўзроўню». Разумейце, як хочаце гэтыя «памылкі», але са слоў сакратара ячэйкі можна было разумець, што правы ўхіл — гэта адкрытае выступленьне супроць індустрыялізацыі і калектывізацыі, а астатняе— усё «дробязь, памылкі». Такую ацэнку правага ўхілу падтрымлівалі некаторыя члены ячэйкі, якія на выступленьне сакратара райкому супроць такое ацэнкі правага ўхілу пачалі кідаць рэплікі: «гэта — ня ўхіл, а звычайныя памылкі, якія ёсьць у кожнага»!

— Нельга лічыць правым ухілам памылкі асобных таварышоў, калі яны зьяўляюцца вынікам пізкага культурнага і палітычнага ўзроўню гэтых таварышоў, — гаварылі тыя члены ячэйкі, якія ня бачаць карэньняў правага ўхілу і не разумеюць яго сутнасьці. А чаму-ж гэтыя таварышы не заўважвалі, што партасьвета ячэйкі была праваленa, часткова дзякуючы таму, што некаторыя члены ячэйкі не наведвалі палітгурткоў, лічачы сябе даволі палітадукаванымі?

Як форма правага ўхілу, прыводзілі выступленьні Лабаноўскаага (выключанага зараз з партыі), а моманты праву правага ўхілу сярод асобных членаў ячэйкі лічыліся памылкамі, паколькі яны былі ў другім выглядзе.

Для яскравасьці падамо такі факт, які меў месца ў Заслаўскай ячэйцы: кандыдат партыі тав. **Дашчынскі** з в. Загор'е адмаўляецца ўступіць у калгас, які арганізованы ў яго вёсцы.

Ці ёсьць тут хоць адна сотая памылкі? Няма! Гэта катэгарычнае адмаўленьне ад падтрыманьня калектывізацыі, памылка? Не! Гэтаму таварышу бюро ячэйкі ніякага спагнаньня не дало за адмаўленьне ад выкананьня дырэктыў партыі.

Або боязьнь аднаго члена ячэйкі, які быў камандыраваны на перавыбары саветаў, выступіць на сходзе ад імя беднаты з падрыхтаванымі на сходзе сялян кандыдатурамі? Гэта што, памылка? Не! Адмаўленьне ад калектывізацыі, боязьнь выступіць супроць кулака, не наступленьне на яго, — ёсьць адступленьне перад кулаком, а гэта завецца правым ухілам.

Нельга сказаць, што ў ячэйцы няма такіх, якія мірацца з правым ухілам, як напрыклад: тав. **Недзьведзь**, будучы членам бюро ячэйкі, падтрымліваў тав. Дашчынскага.

— Што гвалтаваць чалавека, рабіць тое, чаго ён ня хоча, — гаварыў тав. Недзьведзь на агульным сходзе ячэйкі.

Калі гэтыя прыклады і рад іншых (а іх шмат) лічыць толькі памылкамі не заслугоўваючымі ўвагі, то аб правым ухіле ў Заслаўскай ячэйцы гаварыць не патрэбна было, а толькі ўсё лічыць «памылкамі» і спаць на лаўрах.

Цікава, што як на радзе сходаў ячэйкі, на якіх ставіліся даклады аб правым ухіле ў партыі і радзе спэцыяльных нарад ячэйкі, якія склікаліся для прапрацоўкі пастаноў канфэрэнцый і пленумаў па пытаньнях правага ўхілу, выносіліся самыя рэзкія рэзалюцыі супроць правага ухілу. і здавалася, што ячэйка цалкам разумее сутнасьць правага ўхілу.

Дзякуючы ўсяму гэтаму, што вылілася на агульным сходзе ячэйкі ў апошнія дні, прыйшлося і зноў склікаць нараду ячэйкі, ужо райкому, каб нарэшце, таварышы ня лічылі праявы правага ўхілу «памылкамі», а взялі в ім бязупынную барацьбу.

**П. І.**

## Цені „астрахані" ў гаспадарчым вайсковым апараце

### Партарганізацыі, абараняйце гаспадарчы апарат ад напору прыватніка

Як ідзе барацьба са скажэньнем клясавай лініі ў рабоце гаспадарчага апарату вайсковых часьцей? Рад фактаў гаворыць, што гэтыя пытаньні праходзяць неяк міма ўвагі партарганізацый, а ў выніку змычка з прыватнікам, «Астрахань» у мініятуры сямтам праглядае з-за сьпіны гаспадарчай часткі.

**ЗМЫЧКА З ПРЫВАТНІКАМ**

Там, дзе палітапарат і партарганізацыя цікавяцца работай гаспадарчай часткі, там іх увага ў большасьці выпадкаў сканцэнтроўваецца выключна на стыку гаспадарчай часткі з чырвонаармейцам і камандзірам, на якасьці здавальненьня патрэб байцоў, пачкладу і часьці ў цэлым. А як гаспадарчая частка забясьпечвае здавальненьне гэтых патрэб, як яна выступае на рынку, якая яе палітычная клясавая лінія ў пытаньнях загатовак, у рамонце будынкаў і маемасьці—гэта мала каго цікавіць.

Вось некалькі фактаў, якія нам здаецца, павінны прыцягнуць увагу партарганізацый.

Часьцей за ўсё скажэньне клясавай лініі ідзе па лініі загатовак. Рэвізія вайсковае гаспадаркі часьцей БВА органамі дзяржфінкантролю выкрыла рад абураючых фактаў змычкі гаспадарчага апарату часьцей з прыватнікам.

**У Бабруйскім гарнізоне** за 1928-1929 г. закуплена часьцямі ў прыватнікаў розных прадуктаў на 17.000 рублёў. На гэтых закупках №№ палкі пераплацілі прыватніку за нягоднае сала, рыбу, перац, бульбу і рыс 4.553 р., звыш 25 проц., кошту зробленых у прыватніка закупак, ня толькі выданы прыватніку, але выданы яму ні за што, за тавар, які аказаўся нягодным або нават зусім не дастаўлены.

№ полк вымушаны быў у пачатку гаспадарчага году закупіць 200 пудоў капусты і 3.000 пудоў сена праз камісіянэра-прыватніка, якому плаціў 5 проц. камісійных.

**У Полацку,** не загатовіўшы своячасова патрэбнае колькасьці бульбы праз каапэрацыю, часьці гарнізону ў сярэдзіне зімы куплялі бульбу ў прыватніка па 1 р. 60 к. за пуд, тады як увосень плацілі каапэрацыі па 50 кап. У агульнай суме кожная часьць купіла ў прыватніка бульбы на суму каля 3.000 рублёў. Значыць, і тут прыватніку пераплачана не адна тысяча.

**ВАЕННЫЯ ДАСТАЎШЧЫКІ**

Часьці ня толькі загатаўляюць прадукты праз прыватніка, але і супрацоўнічаюць з ім у другіх апэрацыях. № полк пазычыў 1.500 п. сена аднаму прыватніку, а 22 полк прыняў на хаваньне ў палкавыя склады 3.000 кілё ільнянога семя, якое належала другому прыватніку. У 1927-28 г. гэты-ж полк трымаў агентам па загатоўках прыватніка Норкіна, якому плаціў пэнсію. Рад часьцей займаўся абменам прадуктаў з прыватнікамі.

Стварылася цэлая група прыватнікаў, якія спэцыялізаваліся на дастаўках вайсковым часьцям. Акруговая газэта два гады выжывала аднаго прыватніка, які пераходзіў з часьці ў часьць і пад канец нават перафарбаваўся ў каапэратара.

Самы наглы з усіх прыватнікаў—Шумахэр. Ён зьбіваў цэны каапэрацыі, «рэгуляваў» рынак, забясьпечваў часьці ня толькі на зімовай стаянцы, але і выслаў па тэлеграфным патрабаваньні вагон макарон у лягеры.

**НІВОДНАГА ПРОЦАНТУ ПРЫВАТНІКУ**

На аснове матар'ялаў рэвізій фінкантролю РВС БВА выдаў загад, які катэгарычна забараняе зьдзелкі з прыватнікамі. Загад адзначае, што за апошнія 4 гады доля прыватніка ў загатоўках часьцей зьнізілася з 40 проц. да 2 проц. Зараз удзел у загатоўках гароднінны разьмяркоўваецца так: каапэрацыя і дзяржорганы—71 проц., прыватнік-гандляр—2 проц. і непасрэдныя вытворцы—27 проц. На гэты год РВС ставіць задачай: ніводнага процанту прыватніку. Гэта задача можа быць выканана толькі ў тым выпадку, калі палітапарат і партарганізацыі акужуць у гэтай справе сваю патрэбную дапамогу і ўплыў.

Справа ня толькі ў зьнішчэньні «двух процантаў». Трэба прамацаваць і «непасрэдных вытворцаў». Іх-жа 27 проц., а хто яны? Мы маем падставу лічыць, што і тут патыхае прыватнікам. Часьці заключалі мала дагавораў з арцелямі, аб кантрактацыі загаварылі толькі цяпер, і няма сумненьня, што сярод «непасрэдных вытворцаў» побач з с.-г. арцелямі пралез (і ў не малой долі) і кулак, і багатыр-агароднік. Прамацаць, што гэта за «непасрэдныя вытворцы», які сэктар у нашых дастаўшчыках яны цягнуць—сацыялістычны ці прыватна-капіталістычны—гэта задача партарганізацый.

Трэба вытнаць прыватніка ня толькі з самых загатовак, але і спыніць зьдзелкі в ім у справе хаваньня і кансэрваваньня прадуктаў. А то ў Полацку часьці, закупіўшы капусту ў каапэрацыі, аддавалі яе квасіць прыватніку Галёркіну, даючы, пуд сьвежай капусты за 25 ф. квашанай.

**«ТАК КАРЫСЬНЕЙ»**

У № канвойнай роце камсамольцы выступілі супроць заключэньня дагавору з прыватнікам на дастаўку мяса, патрабуючы перадаць дастаўку каапэрацыі, а сакратар ячэйкі і паліткіраўнік заявілі

— Прыватнік адпускае мяса таней за каапэрацыю, мы маем 600 рублёў эканоміі ў год.

— Як удаецца прыватніку прадаваць таней каапэрацыі бяз страт для сябе?

Гэта мяне не датычыць.—заявіў паліткіраўнік.

Узяліся за справу акруговая газэта і аддзел забясьпячэньня, высьветлілі, што прыватнік скупляў мяса ў вакольных сялян, дагавору роты з прыватнікам ня было, фінаддзел аб яго дастаўках ня ведаў, мяса часта дастаўлялася нягоднае. Пад націскам акругі паліткіраўнік запрапанаваў прыватніку заключыць дагавор, зарэгістраваўшы ў фінаддзеле. Прыватнік адразу адмовіўся і дастаўкі спыніў. Калі мімаволі перайшлі да каапэрацыі паліткіраўнік уздыхаў:

«Эх, загінулі нашы 600 руб. эканоміі. За іх-жа можна было здорава палепшыць кацёл».

Ці ня так разважалі ў тых часьцях, дзе заказы прыватніку давалі гаспадарнікі-партыйцы? Відаць, і для іх вузка-дзяляцкія выгады сёньняшняга дня засланялі сабою агульна-клясавыя задачы.

Зараз падыходзіць пэрыяд сэзонных загатовак часьцей. Прыватнік лезе ў дзьверы гаспадарчай часткі, хоча зрабіцца «ваенным дастаўшчыком». Партарганізацыі павінны ўбачыць гэта, абудзіць клясавае пачуцьцё ў партыйцаў-гаспадарнікаў, узяць пад грамадзкі кантроль работу гаспадарчага апарату і ў зародку забіць «Астрахань у мініятуры», якая пратухла гнілымі традыцыямі былога інтэнданцтва. («Кр. Зв.»).

**Р. Н.**

## Аб некаторых задачах па працы ў вёсцы

**(Да прадстаячай нарады загадчыкаў вясковымі аддзеламі АК КП(б)Б)**

Скліканая ЦК КП(б)Б нарада загадчыкаў вясковымі аддзеламі акруткомаў, мусіць абгаварыць рад пытаньняў, зьвязаных з працай у вёсцы і падагуліць вопыт работы аддзелаў за мінулы час.

Нарада павінна вызначыць канкрэтныя мерапрыемствы па паляпшэньні працы аддзелаў дзеля таго, каб яны ў сапраўднасьці сталі належнымі памоцнікамі партыйных арганізацый у справе ўзмацненьня работы ў вёсцы.

Вынікі гадавое працы аддзелаў па рабоце ў вёсцы гавораць аб карысьнасьці іх існаваньня. Між тым, трэба адзначыць, што вясковыя аддзелы, дзякуючы раду прычын, не сканцантравалі ў належнай меры сваёй працы па галоўнейшых задачах, якія выцякаюць з агульных задач партыі ў даны пэрыяд.

Замест таго, каб перанесьці асноўную ўвагу ў сваёй рабоце непасрэдна на вёску, каб арганізаваць сталую сыстэматычную праверку выкананьня пастаноў партыі, правільнасьці выкананьня іх у практычнай працы як акруговымі, так і вясковымі арганізацыямі, зьвязваючы праверку работы з практычнай дапамогай мясцовым арганізацыям, аддзелы ў большасьці сваёй заняліся распрацоўкай і рассылкай новых дырэктыў (рэзалюцый і абежнікаў), на недахват якіх і раней ніяк нельга было паскардзіцца.

Гэта, аднак, ня значыць, што аддзелы не павінны зусім распрацоўваць і даваць належныя паказаньні, дырэктывы і г. д. Гэта патрэбна, але дача іх павінна выцякаць з вынікаў праверкі правільнасьці і своячасовасьці правядзеньня пастаноў партыі, з вынікаў вывучэньня працесаў што адбываюцца на вёсцы, і на падставе гэтага аддзелы павінны высоўваць перад партыйнымі органамі прапановы аб прыняцьці належных мерапрыемстваў па ўхіленьні недахопаў і дачы дадатковых дырэктыў, што выцякаюць з агульнае лініі партыі.

**Недастатковая сувязь з месцамі, недастатковая дапамога вясковым партыйным арганізацыям зьяўляецца адным з галоўнейшых недахопаў у працы вясковых аддзелаў.**

Тлумачыць такое становішча часткова можна тым, што аддзелы па працы ў вёсцы ня мелі яшчэ належнага вопыту і тым, што ня ўсе акруговыя камітэты зьвярнулі належную ўвагу на хутчэйшае афармленьне аддзелаў, умацаваньне іх работнікамі, стварэньне належных умоў працы аддзелаў і г. д.

Выпрацаваньне стаячых перад партыяй задач па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі на новай больш высокай тэхнічнай базе, ажыцьцяўленьне новых форм змычкі рабочае клясы з асноўнымі масамі сялянства, разгортваньне работы па далейшым наступленьні і выкарчоўваньні капіталістычных карэньняў у вёсцы патрабуе значнага паляпшэньня і ўзмацненьня ўсёй работы ў вёсцы, а разам з гэтым і работы саміх вясковых аддзелаў.

Задачы аддзелаў выцякаюць з агульных задач партыі ў вёсцы, таму аддзелы павінны, ня шукаючы чагосьці новага, максымальна разгарнуць сваю дзейнасьць па дапамозе партыйным арганізацыям вырашыць гэтыя вялізарнейшыя задачы—перабудаваць вёску на новы сацыялістычны лад.

**Цэнтрам увагі ў працы аддзелаў павінны быць пытаньні калектывізацыі, вытворчага каапэраваньня, узьняцьця бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, арганізацыі беднаты і г. д.**

У справе калгаснага будаўніцтва неабходна асаблівую ўвагу зьвярнуць на пашырэньне і ўзмацненьне існуючых калгасаў, на павялічэньне абагуленасьці сродкаў вытворчасьці і на сталую арганізацыю палітвыхаваўчай працы.

У спэцыяльных вытворчых відах сельска-гаспадарчай каапэрацыі ўсё яшчэ недастатковы ўплыў беднаты, што зьяўляецца галоўнейшай прычынай, бадай, поўнай адсутнасьці перарастаньня ў важнейшыя калектыўныя формы такіх аб'яднаньняў, як машынныя, пасялковыя і мэліярацыйныя таварыствы. У сувязі з чым неабходна рашуча дабівацца павялічэньня ўплыву беднаты як у складзе пайшчыкаў, так і праўленьнях, арганізаваць пры гэтых відах каапэрацыі групы беднаты, забясьпечыўшы сыстэматычную працу іх, ставячы канкрэтнай задачай наступовы пераход гэтага віду каапэрацыі ў больш складаныя калектыўныя формы.

Трэба праўду сказаць, што вясковыя аддзелы мала зварочвалі ўвагі на значнасьць своячасовых выбараў і ўцягненьне ў практычную працу аграпаўнаважаных, а ў сувязі з гэтым і на практычнае ажыцьцяўленьне такіх мерапрыемстваў, як аграмінімум. У радзе акруг яшчэ да гэтай пары ня поўнасьцю праведзены выбары аграпоўнаважаных і ў большасьці неарганізавана праца з імі, гэтым і тлумачыцца нездавальняючае правядзеньне аграмінімуму на практыцы.

Гэты недахоп патрэбна як мага хутчэй зьнішчыць, бо без уцягненьня масы бядняцка-серадняцкага актыву, без уцягненьня саміх бядняцка-серадняцкіх мас у практычную працу па ўзьняцьці ўраджайнасьці і г. д., немагчыма выканаць задачу павышэньня ўраджайнасьці, паляпшэньня жывёлагадоўлі і г. д.

Вясковыя аддзелы, улічваючы гэты недахоп, павінны асаблівую ўвагу зьвярнуць на забясьпячэньне масавага ўздыму шырокіх бядняцка-серадняцкіх мас у падрыхтоўцы і правядзеньні асеньняй пасеўнай кампаніі.

Асаблівае месца ў працы аддзелаў мусіць заняць пытаньні зямляўпарадкаваньня. Трэба стала сачыць за правільным і поўным правядзеньнем у жыцьцё дырэктыў наконт гэтага. **Зямляўпарадкаваньне павінна поўнасьцю адпавядаць лініі партыі на калектывізацыю сельскае гаспадаркі і рашучае абмежаваньне магчымасьцяй далейшага росту кулацкіх гаспадарак.**

**Практыка арганізацыі хутароў, адрубоў і дробных пасёлкаў (на справе тыя-ж самыя хутары) павінна быць канчаткова спынена.**

Усямерна дапамагаючы партыйным органам у справе ўзмацненьня працы вясковых арганізацый, у першую чаргу партыйных ячэек, па ўзмацненьні кіраўніцтва імі гаспадарчай працай, калгасным будаўніцтвам і г. д.

Аддзелы павінны пільна сачыць і своячасова даводзіць да ведама партыйных органаў і самі павінны весьці рашучую барацьбу з скрыўленьнямі клясавай лініі, з праявамі правага апартуністычнага ўхілу на практыцы, з недаацэнкай значнасьці арганізацыі і работы сярод беднаты.

Разам з некаторым паляпшэньнем працы сярод беднаты, усё-ж гэта галіна застаецца слабой. Аддзелы па працы ў вёсцы не праявілі ў гэтым напрамку належнае энэргіі і ўвагі. Колькасьць груп беднаты ўсё яшчэ недастатковая, кіраўніцтва працай іх слабое. Як можна гаварыць аб дастатковым кіраўніцтве, калі большасьць акруткомаў нават ня ведае колькасьці груп беднаты на акрузе. Няма гэтых вестак і ў значнай колькасьці райкомаў. Дзеля таго, каб поўнасьцю ізаляваць кулака, каб яшчэ мацней замацаваць бядняцка-серадняцкі блёк, трэба **пасапраўднаму ўзяцца за арганізацыю беднаты і батрацтва.**

Вясковыя аддзелы мала зварачалі ўвагі на працу шэфскіх арганізацый, на разгортваньне работы прафсаюзаў на вёсцы. Работу шэфскіх арганізацый трэба ўзьняць на нябывалую да гэтага часу вышыню. Трэба мабілізаваць пралетарскую грамадзкасьць у гарадох на дапамогу партыйным арганізацыям вёскі ў іх працы па перабудове вёскі на сацыялістычны лад. Трэба шырока выкарыстаць практыку пасылкі рабочых брыгад, рамонтных майстэрань, разгарнуць працу па шэфстве гарадзкіх партыйных і камсамольскіх ячэек над вясковымі, гарадзкіх каапэратывамі над вясковымі і г. д.

Надыходзячая пасеўная кампанія павінна прайсьці пад знакам далейшага рашучага ажыцьцяўленьня шэфскай работы і масавага ўдзелу пралетарскіх колаў у практыч

# Аб чым сыгналізуе падлік аб'ектаў ападаткаваньня

**На вучоце жывёлы ёсьць значны недабор параўнальна з мінулым годам.—Шмат утоеных аб'ектаў застаюцца нявыкрытымі.—Задача апарату—выкрыць хітрыкі і камбінацыі кулацтва і дабіцца актыўнай дапамогі беднаты.—Трэба арганізаваць масавую фактычную праверку зробленага падліку**

## Папярэднія вынікі падліку

Падліку аб'ектаў сельска-гаспадарчага падатку мы надаем вельмі важное значэньне. Бо ад вынікаў яго залежыць: 1) правільнасьць ападаткаваньня пасобных груп сялянства, гэта значыць, клясавасьць с.-г. падатку; 2) поўнае выкананьне тых сум падатку, якія прызначаны ў дзяржаўны і мясцовы бюджэт.

Ня гледзячы на гэтыя палітычныя і фінансавыя акалічнасьці, сёлетні падлік аб'ектаў с.-г. падатку праходзіць нездавальняюча. Па 15—20 проц. вёсак БССР ён ужо скончан і паказвае наступныя процанты зьмены леташніх лічбаў:

| АКРУГІ | Пахаць | Лугі | Коровы | Коні | Сьвіньні | Заработкі |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Аршанская | +2,6 | +2,7 | —2,1 | —0,4 | —15,6 | +18,6 |
| Бабруйская | +2,4 | +3,2 | —2,1 | +2,9 | — 5,4 | +51,1 |
| Гомельская | +2,1 | +3,3 | +2,4 | +3,3 | + 5,5 | +11,0 |
| Віцебская | +4,1 | +2,5 | —7,5 | —6,0 | —36,5 | +31,8 |
| Магілеўская | +0,9 | +2,0 | +1,5 | +3,0 | + 3,2 | +27,0 |
| Мазырская | +4,7 | +3,5 | +3,7 | +9,1 | + 3,5 | +18,5 |
| Менская | +3,0 | +4,5 | +0,9 | +0,9 | — 2,8 | +21,7 |
| Полацкая | +5,7 | +3,2 | —9,3 | —5,9 | —37,1 | +39,5 |

Хаця падлічаная пахаць усюды паказвае некаторы прырост, аднак, трэба ўлічыць, што летась заставалася ўтойка каля 20 проц. усяе пахаці. Па жывёле большасьць акруг паказвае нават недабор лескай і Полацкай акругах.

Больш-менш значна павялічваюцца падлічаныя сумы заработкаў. Але і тут падлік не адбівае сапраўднага становішча: мільёны рублёў заработкаў утоены.

Некаторыя раённыя і акруговыя працаўнікі хочуць тлумачыць паўлік жывёлы фактычным скарачэньнем стада. Гэта вельмі небяспечны шлях. Зрэзумела, што лічэньне зімой, недахват кармоў у некаторых мясцовасьцях адбіліся на ліку жывёлы. Але-ж быў і натуральны прырост. Было і так, што шмат кулацкіх гаспадарак, каб схіліцца ад індывідуальнага ападаткаваньня, фіктыўна прадавалі сваю жывёлу за 2—3 дні да вазіцку аб'ектаў.

Задача апарату—папярэдзіць гэтыя хітрыкі кулацтва, дабіцца актыўнае дапамогі беднаты, перавагі яе ў сельскіх падлічальных камісіях.

Трэба арганізаваць масавую фактычную праверку аб'ектаў ападаткаваньня і безадкладна накладаць штрафы на выяўленых злаўмысных утойшчыкаў. Толькі пры паліччы выключнае ўвагі да гэтай справы з боку райвыканкомаў і сельсаветаў магчыма папраўдзе дапушчаныя памылкі.

Трэба адзначыць, што ў апошнія тыдні наглядаецца некаторае паляпшэньне ў справе падліку аб'ектаў сельска-гаспадарчага падатку. Райвыканкомы ўзмацнілі нагляд і беспасрэдны ўдзел у працы сельсаветаў. Пачалі прапаваць праверачныя камісіі. Аштрафавана шмат утойшчыкаў. Бедната лепш упягаецца ў справы правядзеньня сельска-гаспадарчага падатку.

Але трэба замацаваць гэтыя дасягненьні і не зьмяншаць напружанасьць працы. Інакш падлікі палітычныя і фінансавыя задачы кампаніі на сельска-гаспадарчым падатку пацерпяць значную шкоду.

**М. К-н.**

## Слабыя вынікі

**(Пухавіцкі раён, Меншчына)**

На раённай нарадзе ўпоўнаважаных выявілася, што падлік аб'ектаў па раёне прайшоў наогул кепска. Толькі 2-3 сельсаветы паказалі добрую работу. Наогул-жа вынікі падліку зусім нездавальняючыя.

Заўважаецца значнае памяншэньне ўтойнае і дробнае жывёлы. У некаторых сельсаветах, як у Навасёлкаўскім, Вілонскім, Пухавіцкім і інш. заўважваецца масавае ўтойваньне жывёлы і зямлі. Па некаторых сельсаветах як Кнорынскі, праверка зусім не рабілася.

Ня гледзячы на тое, што тэрміны ўжо скончыліся, некаторыя сельсаветы (як Навасёлкаўскі, Дрычынскі, Шацкі і Блускі) яшчэ не закончылі сьпісаў падліку аб'ектаў. Наогул падлік аб'ектаў ападаткаваньня па раёне прайшоў кепска.

## Слабыя месцы работы

Падлік аб'ектаў у Клічаўскім раёне (Гомельшчына) ужо закончыўся. Вынікі падліку па многіх галінах даюць рост аб'ектаў. Але бязумоўна гэтыя вынікі сельга лічыць яшчэ здавальняючымі. Па жывёле адчуваецца недаўлік, асабліва дробнай. Высьветлены выпадкі утойваньня і яшчэ больш ёсьць утоеных аб'ектаў ня выкрытых. Утойваюць аб'екты больш заможныя гаспадаркі, якія ўсякімі спосабамі імкнуцца ашукаць уладу: робяць фіктыўныя падзелы, прадаюць перад падлікам жывёлу, у часе падліку зганяюць жывёлу ў іншыя вёскі.

Пасьля дасканалага растлумачэньня і пакараньня, якія чакаюць утойшчыкаў, самі сяляне на сходах пачалі добраахвотна заяўляць аб прынісцы утоенага. Так, у в. Гарбаткі сяляне добраахвотна заявілі аб прынісцы 2 кароў, 1 коняй, 29 сьвіней, 16 авечак і 20 кароў пчол. Але ёсьць і злосныя утойшчыкі. Райвыканком 56 злосных і заўзятых утойшчыкаў аштрафаваў на 50 руб.—разьмер штрафу на асобных гаспадарках хістаецца ад 3 да 33 руб. У злоснага ўтойшчыка Бубнова Рыгора, які ўтаіў 2 каровы, 2 сьвіньні, 4 авечкі, 16 калод пчол, справу перадалі ў суд.

Асабліва вялікае супраціўленьне ў часе падліку прышлося сустрэць з боку заможных кулацкіх гаспадарак, якія падлягаюць індывідуальнаму ападаткаваньню.

Бачачы, што беднота дапамагае выяўленьню кулацкіх гаспадарак, кулакі імкнуцца шляхам спойваньня гарэлкай, пагрозамі (Зарубецкі сельсавет) прымусіць беднату маўчаць.

Сустракаюцца выпадкі, што і сярод членаў сельсавету ёсьць гаспадаркі, якія падлягаюць індывідуальнаму ападаткаваньню. Прынятымі мерамі па раёне выяўлены 133 моцныя кулацкія гаспадаркі (2,1 проц. усіх гаспадарак).

Недахоп працы па падліку ў раёне заключаецца ў адсутнасьці сталага кіраўніцтва з боку ўпоўнаважаных РВК, якія працавалі ў сельсавеце ўрыўкамі. Слаба ўдзельнічалі ў падліку члены сельсавету. Разам з падлікам не складаліся сьпісы гаспадарак, якія маюць права на ільготу за агра-тэхнічныя мерапрыемствы і агранамія не ўзяла на сябе кіраўніцтва гэтай справай.

**М.**

## Чаму клапочацца аб заможніках

**(Навасёлкаўскі сельсавет, Пухавіцкага раёну)**

На хут. Самін заможнікам Чурынцом пакуль утоена ад падліку аб'ектаў абзаленьня 4 дзесяціны зямлі. Яшчэ ў кастрычніку месяцы была мной падана заява ў Пухавіцкі РВК, каб выкрылі ўтоеную зямлю ня толькі ў заможніка Чурынца, але і ў іншых кулакоў.

Што-ж зрабіў Пухавіцкі РВК па гэтай справе? А вось, што. Былы загадчык фінчастку Шклярык, калі рабіў перапіску ўтоеных аб'ектаў у Саміне, сказаў ён абміную заможніка Чурынца. Характэрна адзначыць яшчэ тое, што Чурынец зямлю ў гэтым годзе запісаў, як і летась, а сельсавет і райвыканком палец аб палец ня ўдарылі, каб зрабіць праверку.

Цікава ведаць, калі, нарэшце, будзе зроблена такая праверка. Трэба, каб пракуратура і РСІ зацікавіліся гэтай справай. Тут ёсьць нехта вінаваты, які дапамагае заможніку Чурынцу ўтойваць зямлю ад падатку.

**Р. Д.**

## Утойваюць аб'екты ападаткаваньня

ВОРША. (Наш кар.). Падлік аб'ектаў ападаткаваньня ў Аршанскім хутка скончыцца. У некаторых раёнах назіраецца зьмяншэньне колькасьці жывёлы ў параўнаньні з мінулым годам. Прычына ў тым, што заможная частка (а гледзячы на яе і некаторыя сераднякі) ня поўнасьцю запісваюць фактычны лік жывёлы.

З боку сельсаветаў і райвыканкомаў ня была зьвернута належная ўвага на гэтую работу, не рабілася праверка паказаньняў плацельшчыкаў і ў адносінах утойшчыкаў ня прымалася ніякіх мер. Толькі ў Дубровенскім і Копыскім раёнах, дзе была праведзена праверка, там ёсьць павялічэньне колькасьці жывёлы. Але мы-б мелі такое становішча і ў іншых раёнах, калі-б было дапушчана ўтойваньне і калі-б утойшчыкі прыцягваліся да адказнасьці.

**А. М.**

## Кулакі заварушыліся

**(Гомельшчына)**

Падлік кулацкіх гаспадарак (для індывідуальнага ападаткаваньня) па Гомельшчыне, які раней праходзіў дрэнна, зараз палепшыўся. Спачатку адзначаны былі выпадкі, калі сельсаветы стараліся стаяць у баку ад гэтай работы і пераваліць яе на ўпоўнаважаных РВК ці АВК. Але даныя дырэктывы зьнішчылі гэткія зьявішчы і работа зрушылася з мёртвага пункту.

Сельсаветамі (ад якіх ёсьць весткі) адабраны для індывідуальнага ападаткаваньня 482 гаспадаркі, і ёсьць упэўненасьць, што ўсе кулацкія эксплёататарскія гаспадаркі будуць поўнасьцю выяўлены.

Трэба адзначыць, што ўжо цяпер кулакі заварушыліся, пачалі ўсюды пісаць, закідалі запытаньнямі, каго лічыць кулаком і каго трэба абкладаць індывідуальна. Амаль усе, як правіла, падаюць скаргі.

Усялякім спосабам запасаць розныя даведкі, што яны быццам не кулакі.

Ні адзін з іх ня хоча прызнаць сваёй гаспадаркі багатай кулацкай.

**А. Г-ч.**

## Пад чым ведамам саўгас Лошыца?

Дзесяць газэтных друкаваных радкоў абляцелі некалькі ўстаноў. Кожная ўстанова адпісалася, адбіткі падшываліся, а справа не вырашалася. А справа-ж вось у чым. У газэце «Зьвязда» месяцаў тры таму назад была надрукавана заметка ў дзесяць радкоў пад загалоўкам:

**ІРЖАВЕЮЦЬ МАШЫНЫ**

**... «У саўгасе Лошыца, Менскае акругі, іржавеюць пад адкрытым небам два паравыя катлы, халадзільнік, кантрольны знарад, паравая помпа, паравая машына і шмат іншых рэчаў, якія засталіся пасьля ліквідацыі бровару ў саўгасе Лошыца яшчэ з часу рэвалюцыі».**

Вось і ўсё. Застаецца толькі каму належыць гэтым пытаньнем зацікавіцца і палажыць канец гэтай безгаспадарчасьці. Але... ня так проста ўсё гэта робіцца. Патрэбна паперовая цяганіна ў наш век.

Бюро расьсьледваньня газ. «Зьвязда» выразку з газэты пераслала РСІ для расьсьледваньня. РСІ ў сваю чаргу пераслала Белсельтрасту для праверкі.

Сакратар юрыскансульт БСТ Сасіноўскі настрачыў для «Зьвязды» адносіну, што Лошыца знаходзіцца ў веданьні Менсельпраму. На гэтым і канец.

Але гэта не магло задаволіць бюро расьсьледваньня. Ўвесь матар'ял быў накіраваны па паказаным адрасе—Менсельпраму. Сакратар Менсельпраму Міцкевіч у сваю чаргу таксама настрачыў адносіну, што Лошыца знаходзіцца ў веданьні дасьледчага інстытуту імя Леніна. Такая адпіска зацікавіла бюро расьсьледваньня і на гэты раз увесь матар'ял з адносінамі быў перасланы дасьледчаму інстытуту.

Але... на шчасьце або няшчасьце і там знайшоўся ўсё-ж сакратар «бумагамаратель», які напісаў:

«... Лошыца знаходзіцца ў веданьні беларускага аддзяленьня ўсесаюзнага інстытуту прыкладной батанікі і новых культур, якое знаходзіцца ў Лошыцы, куды і належыць зьвярнуцца».

Цяжка знайсьці Лошыцу! Сто разоў ехадзіў-бы з Менску ў яе, чым вырашыць якое-небудзь пытаньне з бюракратамі і галавацянамі.

Бюро расьсьледваньня ўсё-ж ня ўпэўнена ў тым, што правільна дан адказ дасьледчым інстытутам.

А ўсё-ж шкода машын. Яны іржавеюць і дагэтуль.

**У. Б.**

*Сацыялістычнае спаборніцтва*

# Першы рапарт фабрыкі „Меншвэй"

## ВА ЎСІХ АСНОЎНЫХ ЗАДАЧАХ СПАБОРНІЦТВА—ЁСЬЦЬ ЗРУХ

**Усім рабочым і служачым фабрыкі „Вітшвэй" і „Гомшвэй".**
**Штабу сацыялістычнага спаборніцтва**

**Дарагія таварышы!**

У выкананьне прынятых на сябе абавязацельстваў па дагаворы сацыялістычнага спаборніцтва і згодна пункту 13-га паказанага дагавору, штаб сацыялістычнага спаборніцтва фабрыкі «Меншвэй» пасылае вам наступныя данясеньні.

Узятым на сябе абавязацельствам паводле дагавору мы павінны былі, незалежна ад арганізацыйнага пэрыяду (пераход на 7-мігадзінны рабочы дзень) давесьці выпуск нашай прадукцыі да 1¾ палітра на аднаго рабочага да канца гаспадарчага году. Мы цяпер гэты пункт выканалі, давёўшы выпуск вырабаў на 1 чалавека да 2,2 на жаночых польтах і 4,95 па прагумавых плашчох.

У адносінах якасьці прадукцыі пытаньне стаіць, па незалежных ад нас прычынах, горш, чым пытаньне аб вытворчасьці вырабаў, з прычыны вялікае колькасьці нядобраякасных тэкстыльных тавараў, што атрымліваюцца з цэнтру. Барацьба за якасьць вядзецца ўсімі перадавымі і сьвядомымі рабочымі, а таксама і адміністрацыйна-тэхнічным персаналам (былі выпадкі псаваньня і глуму з-за нядбайнасьці паасобных рабочых закройнага цэху, за што адміністрацыяй былі накладзены спагнаньні).

Упартая і настойлівая вытворча-выхаваўчая работа, што праводзіцца партыйнай і прафэсыянальнай ячэйкамі пры максымальнай дапамозе адміністрацыі, у былой раней недаровай галіне—прастоях—дала рашучы зрух: прастоі зьнізіліся з 1.377 гадзін у красавіку да 568 гадзін у маі па ўсёй фабрыцы. На аднаго рабочага прастоі ў красавіку складалі 1,91 гадзін, а ў маі прастоі складалі 0,85 гадз., памяншэньне на 55,5 проц.

Пераробкі, памяншэньне якіх прадугледжана ў п. 6 дагавору, павялічаны. Аднэй з прычын павялічэньня пераробак зьяўляецца ўліваньне ў вытворчасьць новых груп рабочых, якія ня маюць яшчэ выстарчальных навыкаў у працэсах фабрычнае працы, а таксама адпускныя пэрыяд, які цягне часта перавышэньне намечанай нормы ў колькасьці за кошт якасьці.

Скарачэньне накапленьня паўфабрыкатаў у вытворчасьці дае станоўчыя вынікі, бо накапленьне паўфабрыкатаў даведзена да нормы Белшвэйтрасту і такім чынам дагавор у гэтай частцы можна лічыць выкананым.

Маючы на фабрыцы «Меншвэй» у асноўным здаровы настрой усёй рабочай масы ў пытаньні ўмацаваньня працоўнай дысцыпліны, можна ўсё-ж адзначыць адзінкавыя выпадкі, калі паасобныя элемэнты што стаяць на пункце погляду: «даць ёй (дзяржаве) работы менш і горш, садраць з яе грошай больш» (Ленін), дэзарганізуюць вытворчасьць, наўмысна вяніжаюць норму, каб дабіцца павышэньня расцэнак і прыработку, лаюць інструктароў-вылучэнцаў і г. д.

Закранаючы прагулы, мы павінны канстатаваць, што тут ёсьць значнае вяніжэньне на 40,5 проц. (май у адносінах да красавіка), але ўсё яшчэ далёка невыстарчальнае; красавік—42 чалавека-дні, май—25 чалавека-дзён. У адносінах валавой прадукцыі, як аднаго з паказальнікаў прадукцыйнасьці працы, мы павінны канстатаваць павялічэньне яе на аднаго рабочага на 4,34 проц. (май да красавіка).

Такім чынам, адзначаючы зрух у асноўных задачах, пастаўленых перад усёй рабочай клясай і рабочымі нашай фабрыкі, і лічачы гэтыя дасягненьні ўсё яшчэ нязначнымі, абяцаючы ўсімі сіламі выканаць узятае на сябе абавязацельства, просім вас паведаміць аб ходзе спаборніцтва на вашай фабрыцы.

З таварыскім прывітаньнем

**Штаб сацыялістычнага спаборніцтва фабрыкі «Меншвэй».**

## СПАБОРНІЧАЮЦЬ „ШПАРКІМ"ТЭМПАМ

Яшчэ некалькі тыдняў таму назад Белсельсаюз выклікаў Белдзяржгандаль на спаборніцтва. Гэта было ў часе гарачкі выклікаў, і Белсельсаюз, як «узорная» ўстанова, адзін з першых зрабіў Белдзяржгандлю горды выклік:

— А ну, «чырвоныя чужаземцы», давайце паборацца, давайце паспрабуем нашы сілы, хто лепш, хто больш, мы вам пакажам, як наша бухгальтэрыя працуе, як яна гібка балянсуе, які ў нас ажур...

— Ну, што-ж паспрабуем, — адказаў Белдзяржгандаль, — і ў нас сядзяць ня тупіцы, а бухгальтары, эканамістыя са значкамі.

Пагаварылі дружна і пачалі работу.

Пацяклі дні, за імі тыдні і на кругавідзе спаборніцтва гэтых двух волатаў было ціха, ніводнага гуку...

— Ну, што-ж, час сабрацца, пагаварыць больш дакладна аб умовах, складзі дагавор, як ва ўсіх сумленных людзей робіцца.

І зноў пацягнуўся час. Нарэшце, пасьля доўгіх чаканьняў быў назначаны агульны сход Белсельсаюзу і Белдзяржгандлю на 26 чэрвеня.

Надыйшоў дзень агульнага сходу.

І як заведзена... сход не адбыўся, бо ад Белсельсаюзу замест 120 чалавек зьявілася ўсяго 11.

— Давайце, хлопцы, адкладзем, — пачалі хваляваца белсельсаюзаўцы, — нельгаж выпрацоўваць умовы калі ад вас ёсьць 80 чалавек, а ад нас 11.

Такім чынам, сход адкладзены на невядомы час.

Першыя вынікі спаборніцтва паміж Белдзяржгандлем і Белсельсаюзам «дасканалыя»...

**Л. МАНІН.**

## ПРАЦА РАЗГОРНУТА, АЛЕ ІДЗЕ ЯШЧЭ ШУРПАТА

Пытаньне сацыялістычнага спаборніцтва на Жлобінскім вучастку Заходніх чыгунак адразу было мясцкомамі недаацэнена: мелася жаданьне зьнізіць яго да спаборніцтва моладзі, камсамольцаў; прафсаюз станавіўся ў позу «дзядзечкі».

За апошнія часы лінія выпраўляецца, разгорнута шырокая растлумачальная праца. На ўсіх станцыях па цэхах складзены камісіі, маюцца вузлавыя, вучастковыя камісіі. Мэты спаборніцтва саюзная маса разумее добра. І першыя вынікі ёсьць: жорстка вядзецца барацьба з прагуламі, прастоямі, манкіраваньнем абавязкаў. Паміж асобнымі брыгадамі вядзецца спаборніцтва ёсьць ударныя брыгады. Цікавы мэтад спаборніцтва між брыгадамі моладзі і старых рабочых. Прадукцыйнасьць працы прыкметна ўзрастае.

Вялізарным недахопам трэба лічыць тое, што не аформлены спаборніцтвы паміж асобнымі дэпо, станцыямі: дэпо Жлобін не падпісала ўмовы па выклику Гомелю і Асіпавічу. Матар'яльны склад Асіпавіч выклікаў Калінкавіцкі склад, дагаворнасьці поўнай няма.

Кепска з спаборніцтвам па аддзеле руху. Кандуктары парашылі прыём цягнікоў зьнізіць з 1 гадзіны да 45 хвілін, здачу—з 30 хвіл. да 20 хвіл., а калі Асіповіцкія брыгады выклікалі лінейныя станцыі на спаборніцтва, гаварылі аб паляпшэньні стаянак, на адчэпкі і прычэпкі водпуску сталага ня было. І яшчэ адно: аддзел руху можа шмат зрабіць іменна ў скарачэньні часу розных прац, значыць, трэба сачыць па гадзіньніку, а ў жлобінскіх брыгад ня ўсе галоўныя кандуктары маюць гадзіньнікі, а кіраўніцтва чыгункі і не шманае.

Ёсьць выпадкі і «рвацтва». Калі даюць месца на прычэпку вагонаў Ясеню, дык Бярэзіна ня лічыцца з гэтым—чапляе свае вагоны за лік Ясеню. Бярэзіна, значыць, прастой зьмяншае, а Ясень ня можа выканаць умоў спаборніцтва. Гэта ўжо зусім шкодная зьява, за якую трэба даць сяму-таму па руках.

Наогул працы яшчэ няма. Яна толькі пачата, наладжанасьці-ж ня мае. Вучкрафсожу папрацаваць прыдзецца яшчэ шмат.

**Ш.**

## За кошт якасьці

Сацыялістычнае спаборніцтва на фабрыцы «Чырвоны Кастрычнік» у Мазыры пачалося ў маі г. г. Але падрыхтоўка да спаборніцтва была праведзена ня зусім дастатковая. Галоўнае, ня было выразнай растлумачальнай работы аб мэтадах правядзеньня сацыялістычнага спаборніцтва.

Хаця па радзе паказальнікаў мы маем вельмі значныя дасягненьні, але ў нас ёсьць і адмоўныя бакі спаборніцтва. **Нашы дасягненьні атрымаліся за кошт якасьці прадукцыі.**

Падамо лічбы. Выхад прадукцыі павялічыўся ў параўнаньні з 1928 годам на 19,8 проц., нагрузка прэсу павялічылася на 5 проц., прадукцыйнасьць працы павялічылася на 11,8 проц., выдаткаваньне сырцу паменшылася на 7,1 проц., выдаткаваньне альбуміну (клей) паменшылася на 16,2 проц., пры павышэньні зарплаты на 3,8 проц.

І вось, побач з гэтымі значнымі дасягненьнямі ёсьць і вялікі недахоп, які гаворыць аб тым, што нашы рабочыя і кіраўнікі спаборніцтвам ня зусім зразумелі мэты спаборніцтва. Гэты недахоп вызначаўся ў тым, што **выхад першага гатунку фанэры зьменшыўся на 42 процанты**, выхад другога гатунку **зьменшыўся на 13 проц.** за кошт павялічэньня выхаду 3-га гатунку фанэры. Такім чынам рост прадукцыйнасьці працы ідзе ў нас за кошт якасьці прадукцыі.

Аб тым-жа, гэта значыць, што на фабрыцы праведзена недастатковая растлумачальная работа, сьведчаць некаторыя «настрої» ў асобных рабочых. Напрыклад, калі выдучылі рабочага Залескага ў якасьці старшыні камісіі па кіраўніцтве спаборніцтвам, ён заявіў, каб яго ад гэтага абавязку вызвалілі, бо ён лічыць спаборніцтва справай лішняй, а таксама ў сувязі з тым, што ён хворы (хаця ніякай хваробы ў яго няма).

Цікава таксама прывесьці фразу аднаго камсамольца: «што я буду праводзіць спаборніцтва на шыі рабочых?...»

Фабрыка «Чырвоны Кастрычнік» заключыла дагаворы з Барысаўскім заводам «Камінтэрн», Мазырскім заводам «Зьвязда» і фанэрным заводам у Віцебску. Такім чынам фабрыка «Чырвоны Кастрычнік» мае супроць сябе тры прадпрыемствы. Калі фабрычная арганізацыя зараз не разгорне належнай растлумачальнай работы і не дабіцца паляпшэньня якасьці прадукцыі пры захаваньні цяперашніх іншых паказальнікаў, тады мы будзем не на першым месцы, а на апошнім.

**Н.**

# Скарыстаць агранома перш за ўсё на сваёй рабоце

Пашырэньне рэканструкцыйных працэсаў у сельскай гаспадарцы значна павялічвае ролю аграномічных працаўнікоў. Імкненьне да сельска-гаспадарчых ведаў, імкненьне сялянства да палепшаных спосабаў вядзеньня сельскай гаспадаркі павялічвае попыт на аграномічных працаўнікоў да нябывалых разьмераў. Першая скарга сялянства на любым сходзе—«чаму да нас аграном рэдка прыяжджае?» Гэтыя скаргі пра рэдкае наведваньне агранома, пра слабое аграномічнае абслуговаваньне можна тысячамі прачытаць у сялянскіх допісах і карэспандэнцыях у газэты.

Праблема аграномічных кадраў, іх колькасьці і якасьці, зараз становіцца актуальным пытаньнем, якое трэба, не чакаючы, вырашыць. Пасьпяховая калектывізацыя, рост вытворчага каапэраваньня, уздым ураджайнасьці, разьвіцьцё вытворчых сіл сельскай гаспадаркі, усе гэтыя кардынальныя пытаньні ў пэўнай меры ўпіраюцца ў пытаньні колькасьці і якасьці аграномічных кадраў.

Нам здаецца, што зараз ужо насьпеў час, каб пытаньні падрыхтоўкі аграномічных кадраў, сыстэмы аграномічнай работы, якасьці агранома, нашых патрабаваньняў да апошняга, вынесьці на абгаварэньне шырокай савецкай грамадзкасьці. Гэта было-б карысна як для аграномічных працаўнікоў, у сэнсе больш поўнага зразуменьня сваіх абавязкаў, так і для розных устаноў і арганізацый, у сэнсе правільнага скарыстаньня аграномічных кадраў. Такое абгаварэньне карысна было-б і Наркамасьветы для лепшай пастаноўкі навучальнай справы як у сельска-гаспадарчай акадэміі, так і сельска-гаспадарчых тэхнікумах.

Спадзяючыся, што ўсе зацікаўленыя асобы і ўстановы прымуць актыўны ўдзел у абгаварэньні гэтых пытаньняў, мы дазволім сабе спыніцца на адным: на пытаньні правільнага скарыстаньня аграномічных працаўнікоў. У сьнежні месяцы 1928 г. была выдана пастанова «пра арганізацыю і ўзмацненьне аграномічнай работы ў БССР».

Гэта пастанова ў аснове сваёй мае дзьве асноўныя ўстаноўкі. Першая ўстаноўка—**дабіцца адзінага пляну аграномічнага ўзьдзейнічаньня на сельскую гаспадарку.** У нас аграномы працуюць па лініі эморганаў, каапэрацыі, саўгасаў, прадпрыемстваў. Па кожнай лініі будуюцца пляны, якія ў большасьці ніколі не ўзгадняюцца в агульна-раённым плянам па сельскай гаспадарцы. Як вынік няўзгодненасьці ў рабоце, адсутнасьць пэўнай сыстэмы, разьбежнасьць у мерапрыемствах і г. д. Пастанова СНК дала ясную ўстаноўку наконт узгадненьня плянаў усіх арганізацый і ўстаноў, якія працуюць у галіне сельскай гаспадаркі, з агульна-раённым плянам і што «раённы аграном у раёне зьяўляецца беспасрэдным і адказным кіраўніком і арганізатарам усёй аграномічнай работы ў раёне паводле зацьверджанага агульна-раённага пляну».

Другая ўстаноўка вельмі важная з пункту погляду правільнага скарыстаньня аграномічнага пэрсаналу па мясцох. Рад пунктаў пастановы накіраваны выключна на тое, каб «вызначыць, як правіла, вызваленьне раённага аграномічнага пэрсаналу ад выкананьня працы, не прадугледжанай зацьверджанымі агульна-раённымі плянамі па агрыкультурных мерапрыемствах».

Наколькі ажыцьцяўляецца адзінства пляну аграномічнага ўзьдзейнічаньня, сказаць цяжка. Страшна гэта. У нас яшчэ новая, і можна думаць, што аграном, які працуе ў саўгасе, лічыць сябе аграномам, які ў саўгасе толькі і павінен працаваць. Што яму да раённых плянаў, да сувязі з сельскай гаспадаркай раёну, калі ў яго ёсьць Белсельтрэст.

Па ўсіх гэтых пытаньнях трэба многа папрацаваць каб на практыцы ажыцьцявіць адзінства савецкай аграноміі. Жыцьцё ўжо цяпер гэтага моцна патрабуе. Невыкананьне толькі шкодна адаб'ецца на эфэктыўнасьці нашых мерапрыемстваў; пасьпяховасьці працы аграномаў. Але рана ці позна само жыцьцё выпраўліць гэту правільнасьць «самастойнасьць».

Пытаньне-ж аб правільным скарыстаньні агранома на вёсцы яшчэ і дагэтуль не пасунулася наперад. Пастанова СНК у даным выпадку зьявілася дакумантам, афіцыяльна вызначаным, як павінен выкарыстоўвацца аграном. Але каб гэтая пастанова ўжо на сёнешні дзень дала свае рэальныя вынікі, таксама сказаць тяжка. Якія-ж факты мы маем, каб так сьцьвярджаць? Фактаў такіх надзвычайна многа. Каб аграномы больш актыўна ўдзельнічалі ў друку, мы-б гэтых фактаў мелі-б яшчэ больш. Поруч з гэтым, зразумела, мы больш скора зьнішчылі-б тую недарэчнасьць, якая зараз назіраецца адносна скарыстаньня агранома.

Дагэтуль райвыканкомы ўскладаюць на аграномаў ня плянавую працу, дробна-тэхнічнага і не аграномічнага зьместу. Кожны год мы маем тысячы фактаў, калі аграномы пасылаюцца па абмеры плошчаў для выяўленьня ўтоенай ад падатку плошчы. У Мазырскай, Бабруйскай і іншых акругах гэты спосаб «нагрузкі» агранома да таго ўкараніўся, што ў радзе раёнаў зусім ня бачаць больш сур'ёзных заданьняў для агранома.

Абсьледваньне вымачак таксама чамусьці ўскладаецца на агранома, прычым у Скрыгалаўскім раёне аграном Марцынэўскі затраціў на гэту працу больш 40 дзён.

З посьпехам такую работу мог-бы выканаць і сельсавет, аднак, ня гледзячы на тое, што ў Мазырчыне наогул мала аграномаў, усё-ж не знайшлі для т. Марцынэўскага больш карыснай работы (правільней кажучы, не далі працаваць над больш важнымі пытаньнямі).

Інвэнтарызацыя маемасьці РВК у радзе акруг ускладаецца на аграномаў. Дробная тэхнічная праца па канцылярыі земчасткі РВК на аснове шматгадовай практыкі ляжыць на аграномах.

Параўнайце ўсе гэтыя абавязкі з тым палажэньнем, што «аграном зьяўляецца ня толькі праваднікам савецкай сельска-гаспадарчай палітыкі, але і практычным арганізатарам вытворчасьці», што аграном зьяўляецца актыўным будаўніком і кіраўніком калектыўнага земляробства.

Што мае агульнага з арганізацыяй вытворчасьці, з будаўніцтвам калгасаў перапіска паперак у РВК ці інвэнтарызацыя маемасьці апошняга? Здаецца, нічога. Для канцылярскай работы ёсьць справаводы, а аграномы ёю не павінны займацца. Аднак, РВК гэтага не разумеюць. А разумець такую простую рэч даўно ўжо час.

Наконт забесьпячэньня матар'яльна-бытавых умоў агрэпрацаўнікоў справа пастарому дрэнная.

Так, дзе адсутнічае аграпункт агрономам павінны выдавацца сродкі на наём кватэры. РВК часта не адпускаюць ёцца на паперы. У радзе раёнаў, дзе сродкі адпускаюцца, яны выдаюцца агрономам у значна меншым разьмеры, чым патрэбна (2-3 рублі ў месяц). Сродкі на спецвопратку скарачаюцца супроць норм Наркамправаў ў 1½-2 разы. Найбольшая-ж бяда звычайна са сродкамі перасоўкі. Аграному, каб пасьпяхова працаваць, трэба быць на вёсцы, а не сядзець у раённым цэнтры. Чакаць, пакуль сялянства прыдзе да агранома, і ня ісьці самому да сялянства, так працаваць можа толькі зусім не грамадзкі аграном, а фэльчар. І вось у самы разгар падрыхтоўкі да веснавой сяўбы агрономы ў большасьці ня мелі сродкаў перасоўкі. Асабліва цяжкое становішча ў даным выпадку было аграномаў, якія працуюць не ў раённых цэнтрах, а ў падраённых. Людзі літаральна месяцамі хадзілі ад вёскі да вёскі пехатой, выбіваліся з сіл, але выконвалі работу. А пасьля таго, як праводзілі веснавую пасеўную кампанію, падавалі заявы аб выхадзе з працы. Такія выпадкі назіраліся сёлета ў Бабруйскай акрузе і трэба сказаць, што некаторыя РВК сяму-таму навучыліся. Але ў масе сваёй яшчэ не зьвярнулі належнай увагі, і да гэтага часу посьпех працы агранома залежыць ад таго, дасьць РВК грошы ці фурманку для паездак, ці ня дасьць.

Цягнуцца так далей справа ня можа. Пасьпяховае выкананьне задач сацыяльна-тэхнічнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі патрабуе правільнага скарыстаньня агранома, стварэньня нармальных умоў для іх работы. Увага аграному ня толькі на словах, але і на справе. Практычнай увагі да агранома мы павінны ў першую чаргу запатрабаваць ад РВК, якія непасрэдна кіруюць агрономамі. Там, дзе РВК працуе добра, там і праца агранома больш эфэктыўна. А дзе РВК толькі адмініструє, там належнай працы агранома можна і ня ўбачыць.

**М. ЗЫБКАВЕЦ.**

# Трэба аздаровіць апарат Белдартрансу

У кіраўніцтве Белдартрансу на 80 проц. работнікі зьяўляюцца спэцыялістамі, інжынэрамі, тэхнікамі і г. д. Ся від іх, бязумоўна, вялікая частка такіх работнікаў, якія цалкам аддаюць свае сілы і здольнасьці сацыялістычнаму будаўніцтву.

Побач з імі ёсьць паасобныя спэцыялісты, якія прыносяць шкоду дзяржаўнасьці. Пабудова дарогі (на адным з участкаў) даводзіць, наколькі сярод некаторых інжынэраў і ў тым ліку—кіраўнікоў, няма ўзгодненасьці і сур'ёзнага падыходу да справы. Былі пабудаваны два праекты пабудовы дарогі. Паводле першага варыянту дарога праходзіць да канчатковага пункту далей на 5 клм., чым па 2-м варыянце. Большая частка інжынэраў-спэцыялістых далучылася да 2-га варыянту. У канчатковым выніку атрымалася, што памочнік начальніка кіраўніцтва Лашч не прыслухоўваўся да іншае думкі і зацьвердзіў першы праект.

У выніку атрымліваецца, што было зарачана 40.500 р., будаўніцтва па 1-м варыянце прыпынена і распачата пабудова на 2-м варыянце.

Тое-ж самае пры пабудове віцебскага мосту. Там таксама мяняліся па некалькі раз праекты пабудовы. Распачаты былі работы, затрачана некалькі дзесяткаў тысяч рублёў і потым работы прыпынілі.

У адносінах загатоўкі і падвозкі будаўнічых матар'ялаў, таксама ёсьць непрадумальнасьці. Да зацьверджаньня каштарысу выдаткаў па будаўніцтве дарог цэнтрам было прыступлена да загатоўкі, і калі цэнтр скараціў каштарыс будаўнічых работ, то аказалася, што загатоўлены матар'ялы на некалькі дзесяткаў тысяч руб. ня будуць у гэтым будаўнічым сэзоне скарыстаны.

Ня ведаю, па чыёй віне, але ёсьць факты самаволькай парубкі лесу як будаўнічага, так і маладняка. У выніку гэтых самавольных парубак пры пабудове дарог прыходзіцца кіраўніцтву плаціць як карапёны кошт, так і штраф па 10.000 руб. і больш.

Вучасткі несвалчасова ўносяць страхавыя ўзносы і таму прыходзіцца плаціць пені па некалькі сот рублёў. Так, напрыклад, за несвалчасовае ўнясьненьне сацстраху грошай, Рослаўскі вучастак заплаціў адной толькі пені 565 р.

Бываюць выпадкі фіктыўных камандровак. Камандыроўкі кіраўніка групы забесьпячэньня інжынэра Пятрова зьяўляюцца асабліва характ

ВЯРБОЎКА Ў ВАЙСКОВЫЯ ШКОЛЫ

## Акругі спакойна сьпяць

**Папярэднія даныя аб вярбоўцы ў вайсковыя школы гавораць ад тым, што акругі вельмі олаба ўдзельнічаюць у вярбоўцы, некаторыя з іх ня выканалі раскладу на падрыхтоўчыя курсы, іншыя вельмі нядбайна аднесьліся, да падбору кандыдатаў. На месцох ня былі растлумачаны ўмовы прыёму.**

**Прамаргалі кампанію вярбоўкі і камсамольскія арганізацыі. Іх удзел у кампаніі амаль не адчуваецца.**

**За час, які застаецца да канца кампаніі, трэба ўзмацніць вярбоўку ў вайсковыя школы, сканцэнтраваўшы ўвагу на рабоце на прадпрыемствах.**

**З 15-га ліпеня пры АВВШ арганізуюцца курсы па падрыхтоўцы кандыдатаў ад вайсковых часьцей БВА.**

## Уводзіцца вайсковая падрыхтоўка ў школах

Сёлета праводзіцца ўпяршыню ў выглядзе практыкі, у апошніх групах дзевяцігодак вайсковая падрыхтоўка. Вайсковая падрыхтоўка будзе праводзіцца ў 8 і 9 групах працоўных школ. Вучні будуць рыхтавацца на адзіночнага байца пяхоты (стральца).

Чаму гэта робіцца? Таму, што ў 1930 г. у вышэйшыя школы увальецца кантынгэнт, што скончыў рабфак і на рабфаку атрымаў падрыхтоўку адзіночнага байца. Адначасова з ім у ВНУ прыдзе і моладзь са школ 2-й ступені, бяз усякіх вайсковых ведаў. Гэта выклікала-б вялікія няўвязкі ў справе правядзеньня вышэйшай дапрызыўнай падрыхтоўкі ў ВНУ, бо слухачоў ВНУ прышлося-б падзяляць на дзьве групы—прашэўшых вайсковае навучаньне на рабфаках і на невывучаўшых яго ў школах 2-й ступені. Прышлося-б вылучыць значны кадр вайсковых выкладчыкаў, арганізоўваць новыя групы і г. д.

У першую чаргу вайсковая падрыхтоўка ў школах 2-й ступені уводзіцца ў буйнейшых цэнтрах. У будучым годзе магчыма ўвядзеньне вайсковага навучаньня ў школах 2-й ступені ва ўсіх вялікіх гарадох.

Асоавіяхім і Наркамасьветы павінны заняцца вайсковай падрыхтоўкай моладзі, якая навучаецца ў 9 групах школ. Моладзь трэба падцягнуць у стралковых адносінах, азнаёміць яе з тапаграфіяй і г. д.

У гэтым-жа годзе, у выглядзе практыкі рад тэхнікумаў пераводзіцца на вышэйшую дапрызыўную падрыхтоўку. Уся падрыхтоўка будзе праходзіць пад кіраўніцтвам вайсковых кіраўнікоў вышэйшых навучальных устаноў.

## На прадпрыемствах амаль нічога ня робіцца

У гэтым годзе ў аб'яднаную беларускую вайсковую школу будзе прынята 150 курсантаў. Каб выканаць лёзунг—рабочую і батрацкую моладзь—у вайсковыя школы—пры школе арганізаваны падрыхтоўчыя курсы для паступаючых. Курсы разьлічаны на 100 месц і пачалі работу з 1-га чэрвеня. Але да гэтага часу курсы яшчэ поўнасьцю не ўкамплектаваны, некаторыя раёны ня выканалі раскладу. Гэта гаворыць аб тым, што ў раёнах і на заводах не аднесьліся з належнай увагай да вярбоўкі моладзі ў вайсковыя школы. На некаторых фабрыках і заводах, як напрыклад, на заводзе «Энэргія», рабочыя ня ведаюць аб правілах прыёму ў вайсковыя школы, ніхто не зацікаўлены ў тым, каб растлумачыць. Але гэтага мала. Мала ведаць аб правілах прыёму, моладзь больш цікавіць быт у школе, у першую чаргу, і жыцьцё камандзіра пасьля скончэньня школы. Тройкі па вярбоўцы павінны быць забясьпечаны выстарчальнай літаратурай, ведаць усе ўмовы жыцьця курсантаў у школе і камандзіра пасьля выпуску і азнаёміць з імі моладзь на прадпрыемстве. Для лепшай вярбоўкі ў вайсковыя школы трэба практыкаваць гутаркі ў цэхах, вечары пытальняў і адказаў. Прафсаюзныя бібліятэкі павінны быць таксама папоўнены адпаведнай літаратурай.

Адбор у вайсковыя школы—пытаньне вельмі важнае і на яго павінна быць зьвернута сур'ёзная ўвага з боку камсамольскіх арганізацый і Асоавіяхіму. У ліку кандыдатаў, якія пасылаюцца ў вайсковыя школы, павінна быць ня менш 60 проц. камсамольцаў і як мага больш рабочых. Гэтай сур'ёзнай увагі, якая патрабуецца ад усіх арганізацый, якраз і няма.

Паасобныя маладыя рабочыя лічаць, што на заводзе яны «могуць зарабіць столькі-ж, колькі камандзір пасьля выпуску» і таму ня хочуць ісьці ў вайсковыя школы.

З гэтымі поглядамі на мясцох трэба змагацца. Спакойныя адносіны да пытаньня абароны краіны павінны быць ліквідаваны.

Р. ПЯТРОЎСКІ.

## Капрызы сьледчага Блок

У Пухавіцкім раёне пры райвыканкоме працуе жанчына-сьледчы тав. Блок. Працуе яна там нядаўна, тым ня менш пасьпела абюракраціцца.

Так, у самы разгар пасеўнай кампаніі яна выклікала для допыту рабочага Габрыелаўскага саўгасу, які знаходзіцца ад Пухавіч на адлегласьці 50 вёрст. Рабочы прыехаў к канцу заняткаў, і сьледчы Блок адмовілася яго выслухаць. Рабочы пачаў прасіць, каб яна яго дапытала зараз-жа, бо яму чакаць няма калі ў зьвязку з пасеўнай кампаніяй. Але Блок упарта адказвала: «мой час скончыўся, чакайце да заўтра» і пашла дамоў.

Рабочы доўга ня ведаў, што рабіць, але, нарэшце, адважыўся пайсьці да яе на кватэру. Пры ўваходзе на двор рабочага спаткала хатняя работніца сьледчага. Выслухаўшы скаргу, хатняя работніца паведаміла, што т. Блок дома, але што яна ёй загадала не гаварыць аб тым, што яна дома. І яна просіць рабочага ня выдаваць яе, бо Блок заўсёды яе лае за гэта. Рабочы абяцаў. Тады хатняя работніца паказала, як трапіць да грознага сьледчага. Рабочы паслухаў яе парады, і праз чорны ход увайшоў у дом і зноў пачаў прасіць сьледчага Блок аб тым, каб яна ўвайшла ў яго становішча і зьняла з яго допыт. Але Блок зноў заявіла, што яна скончыла сваю справу і больш ня хоча з ім гаварыць.

— Прыдзеце заўтра а 9 гадз.

Рабочы ўбачыў, што просьбы яго не дапамогуць і парашыў заўтра прыйсьці роўна а 9 г., каб хутчэй паехаць

Але дарэмна! Тав. Блок, якая так акуратна канчае работу, зьявілася на пасяджэньне са спазьненьнем на паўтары гадзіны. І рабочы патраціў 2 дарагія дні.

Падам другі факт. 23 чэрвеня я была камандыравана ў гэты-ж раён па справах шэфтаварыства. Зайшоўшы ў адну з прыватных крам, дзе прадаецца вада і квас, я ўбачыла, як за сталом сядзела восем маладых хлапцоў, якія адкрыта пілі гарэлку, а над сталом стаяла шмат пустых бутэлек з-пад гарэлкі. Крама гэта знаходзіцца побач з памяшканьнем канцылярыі сьледчага. Калі я зайшла да сьледчага Блок і заявіла ёй аб тым, што робіцца побач і прасіла прыняць якія-небудзь меры супроць прыватніка, які гандлюе замест квасу гарэлкай, тав. Блок спачатку зусім не хацела гаварыць са мной, а потым сказала: «ідзеце ў міліцыю і заяўляйце, а гэта не мая справа». Я папрасіла яе пайсьці, пакуль ня позна, хаця-б упэўніцца ў факце, але т. Блок, раззлаваўшыся, заявіла: «гэта ня ваша справа» і, стукнуўшы дзьвярыма, пашла.

Вось як працуе сьледчы Блок. Ці патрэбны на вёсцы такія работнікі?

ДАЎГАЛАНЦЕВА.

# МЕНСК

## У Савеце Народных Камісараў

### Гаспадарчае ўпарадкаваньне 27 мястэчак

СНК пастанавіў уключыць у плян гаспадарчага ўпарадкаваньня мястэчак, на 1929-30 г. акрамя 18 мястэчак, дзе праца распачата ў мінулым годзе, яшчэ 9 мястэчак: Жыткавічы, Падабранку, Старобін, Пухавічы, Шацк, Карму, Талачын, Чашнікі, Вушачы. Усяго, такім чынам, гаспадарчым упарадкаваньнем будзе ахоплена 27 мястэчак.

У гэтых 9-ці мястэчках намечана палепшыць быт 2.000 сем'яў: больш за тысячу сем'яў будзе надзелена зямлёй, каля 800 сем'яў будуць уцягнуты ў саматужна-прамысловую каапэрацыю.

Акруговым выканаўчым камітэтам, Наркамзему разам з Белкамзетам, прапанавана пры перасяленьні і ўпарадкаваньні насельніцтва мястэчак арганізоўваць пераважна калектыўныя гаспадаркі. Беларускаму саюзу саматужна-прамысловай каапэрацыі даручана пашырыць існуючыя арцелі і арганізаваць рад новых. НК Асьветы павінен арганізаваць у 1929-30 г. 8 майстэрань для моладзі мястэчак.

СНК прызнаў патрэбным вылучыць у цэнтры і акругах спэцыяльных упоўнаважаных, якія павінны кіраваць гаспадарчым упарадкаваньнем мястэчак.

### Рабочыя брыгады правяраюць запазычанасьць ва ўстановах

Сэкцыя РСІ Менскага гарсавету пачынае праверку запазычанасьці ва ўстановах. У першую чаргу будуць абсьледаваны МЦРК, Менсельпрам, саматужна-прамысловы саюз, камунальна-абслугоўваючы трэст і інш. Для гэтай мэты арганізаваны 6 рабочых брыгад з членаў сэкцый, рабочых прадпрыемстваў і дэлегатак. Праверка пачнецца з 1-га ліпеня.

### Абсьледваньне работы РКК на прадпрыемствах

Наркампрацы БССР скончыў абсьледваньне работы РКК па 12 прадпрыемствах Беларусі—абуткоўай фабрыкі, хлебазаводу, будаўніцтва ўнівэрсытэцкага гарадка, заводу «Рухавік Рэвалюцыі» ў Гомелі, папяровай фабрыкі «Спартак» і інш.

Гэтымі РКК за 2-х месячны пэрыяд разгледжаны 541 канфлікт, з якіх 181 вырашаны ў карысьць рабочых, 279—адміністрацыі, 66 канфліктаў перададзены ў вышэйшыя інстанцыі.

Найбольшы лік канфліктаў прыходзіцца на швейную фабрыку ў Віцебску—132, на ільнапрадзільную ф-ку ў Высачанах—87.

Папярэднія вынікі абсьледваньня паказваюць, што рабочая маса і значная частка працаўнікоў гаспадарчых арганізацый слаба знаёмы з новым парадкам вырашэньня канфліктаў.

### Аб выдачы заборных кніжак

**З 29-га чэрвеня часова спыняецца выдача заборных кніжак у аддзяленьні МЦРК па Савецкай вул., № 37. Выдачай займецца стол пайшчыкаў пры МЦРК (Інтэрнацыянальная, 1).**

### Прыём у БДУ

**1-га ліпеня пачынаюць працаваць прыймовыя камісіі пры БДУ, за выключэньнем хэміка-тэхналягічнага факультэту. З 15-га жніўня пачынаюцца прыймовыя іспыты.**

**Арганізавана прыймовая камісія пры рабфаку; старшынёй яе зьвяўляецца дацэнт Лойка.**

**Пры выканбюро БДУ арганізаваны стол даведак.**

### Дапамога радыё-аматарам

**Беларускі радыё-цэнтр арганізуе сыстематычную кансультацыю па пытаньнях радыё-тэхнікі для радыё-аматараў. Арганізуюцца таксама майстэрні для рамонту радыё-апаратуры. Радыё-цэнтр мяркуе выпусьціць 2-хтыднёвую газэту па пытаньнях радыё на белмове.**

### Курсы па падрыхтоўцы вылучэнцаў у савецкі апарат

З 1-га ліпеня адкрываюцца курсы па падрыхтоўцы вылучэнцаў у савецкі апарат на 120 чал. Курсы разьлічаны на 2 месяцы. Для часткі курсантаў абсталяваны інтэрнат.

### Вынікі праверкі і чысткі апарату ЦСУ

Камісія па праверцы і чыстцы апарату ЦСУ закончыла сваю працу.

Учора ў клюбе саўгандальслужачых адбыўся агульны сход супрацоўнікаў ЦСУ.

З вялікім дакладам аб выніках праверкі і чысткі апарату ЦСУ выступіў старшыня камісіі тав. Дрылёнак.

— Камісія па праверцы і чыстцы апарату кажа тав. Дрылёнак—працавала звыш месяцу. Уважліва прапрацавала камісія ўвесь матар'ял, які быў дабыты рабочай брыгадай і лёгкай кавалерыяй.

Вынікі праверкі і чысткі апарату ЦСУ наступныя:

**Зьнята з працы ПАЛЕЙЧЫК** за антысэмітызм. Таксама забаронена ёй займаць якія-б там ні было пасады ў савецкіх установах, акрамя фізычнае працы.

**Адамовічу** пастаўлена на від за групоўкі ў сэкцыі дынамікі на «адмаўцаў» і «маркаўцаў». **Маркаву** камісія абвясьціла вымову за сплетні, абмеркаванасьць і інш. **Гіпянаву** пастаўлена на від як кіраўніку сэкцыі дынамікі, які ня прымаў ніякіх мер да спыненьня сплетняў і інш.

**Бруку** камісія абвясьціла вымову за парушэньне працыскыпліны, **Ваксэнбургу і Дункан** абвешчана камісіяй вымова за сплетні. Абвешчана вымова **Янушавай** за грубасьць, хуліганства і нявытрыманасьць.

Матар'ял, які быў у камісіі аб супрацоўніку **Папо**, перададзены Цэнтральнай камісіі.

## Перад чырвоным міжнародным днём

### На нарадзе Мопраўскага актыву г. Менску

Пазаўчора адбыўся сход актыву Мопру, на якім сакратар ЦК Мопр'у БССР т. Калмык зрабіў даклад аб рабоце III пленуму ЦК Мопр'у СССР і аб падрыхтоўцы да дня 1-га жніўня.

Апошні пленум ЦК Мопр'у СССР,—кажа т. Калмык прызнаў, што рост бедакажа тэрору за рубяжом прымусіў мопраўскія арганізацыі некаторых заруб'ежных краін перанесьці сваю работу ў падполье. Гэта не паслабіла, а наадварот пашырыла мопраўскія арганізацыі і ўзмацніла іх працу. III-ці пленум Мопр'у, у адказ на разгул белага тэрору заклікаў працоўныя масы СССР яшчэ больш узмацніць рады Мопр'у. Але аднаго колькаснага росту мопраўскіх арганізацый мала, трэба палепшыць і якасьць працы. У нас, у БССР, усюды адчуваецца вялікая актыўнасьць членаў Мопр'у але-ж уліку актыву і яго працы мы ня маем. У нашай арганізацыі, якая працуе ў пераважна-сялянскай краіне, вельмі мала сялян. Гарадзкія арганізацыі Мопр'у павінны больш зьвязацца з сельскімі.

III-ці пленум ЦК адзначыў,—кажа т. Калмык, што ня зусім добра абстаіць справа і з шэфствамі над замежнымі турмамі. Мы мала зьвяртаем увагі на прэсу, якая кожны дзень асьвятляе зьверскія зьдзекі буржуазіі над замежнымі рэвалюцыйнымі рабочымі. Некаторыя арганізацыі нават ня робяць выразак з газэт. Мопраўскія арганізацыі раду месц слаба адгукваюцца на заклікі да дапамогі. III-ці пленум ЦК Мопр'у дэталёва абгаварыў пытаньне аб чырвоным дні 1 жніўня, гэты дзень павінен выліцца ў магутную хвалю пратэсту працоўных мас супроць новай вайны, якую міжнародны імпэрыялізм дапамогай сацыял-дэмакратыі рыхтуе ў першую чаргу супроць нашае савецкае краіны.

Мопраўскія арганізацыі БССР павінны прыняць самы актыўны і шырокі ўдзел у правядзеньні гэтага дня. Увесь мопраўскі актыў трэба мабілізаваць для правядзеньня гэтай кампаніі, якой надаецца выключнае палітычнае значэньне.

Выступіўшы па дакладу т. Хмялеўскі адзначыў, што ў арганізацыях адсутнічае патрэбная літаратура.

Тав. Норкіна адзначыла, што ў працы Мопр'у прымаюць малы ўдзел жанчыны.

Тав. Пампэр і іншыя таварышы адзначылі, што мопраўцам трэба дэманстраваць асобнай калёнай. Плян падрыхтоўкі да міжнароднага чырвонага дня ўжо разасланы па ўсіх акругах Мопр'у.

В. К.

### Заклік пленуму камітэту мэталістых

**Пленум Беларускага Камітэту саюзу мэталістых даручыў усім райкомам і фабзаўкомам саюзу прыняць самы актыўны ўдзел у правядзеньні міжнароднага чырвонага дня—1-га жніўня. Прафарганізацыі павінны растлумачыць рабочым - мэталістым палітыку сусьветнай буржуазіі, якая імкнецца пад шырмай гаварыльні ў Лізе Нацый утаіць шалёную падрыхтоўку да новай вайны; растлумачыць ролю сацыял-фашыстых у падрыхтоўцы бойні. Усе мэталістыя БССР павінны прыняць удзел у правядзеньні дня 1-га жніўня.**

**Іх лёзунг — «УСЕ СІЛЫ — НА ЎЗМАЦНЕНЬНЕ САВЕЦКАЙ МЭТАЛЯПРАМЫСЛОВАСЬЦІ — АСНОВЫ АБАРОНАЗДОЛЬНАСЬЦІ СССР».**

## СУД

### За ашуканства дзяўчыны тры гады зьняволеньня

Акім **Дзехцяроў** 25 г., жанаты, мае траіх дзяцей. Яго ўлюбёныя заняткі—валачыцца за дзяўчатамі і граць на гармоніку.

У жніўні 1928 г., у прыгожы цёплы вечар, у вёсцы Быкі, Цэрахоўскага раёну, чутны былі разудалыя гукі гармоніка. Сабраліся шмат дзяўчат і хлопцаў слухалі гармонь, скакалі. Пасьля скокаў падзяліліся па пары, «Гэрой дня» Дзехцяроў узяўся «абходжваць» 17 гадовую дзяўчынку Рагавую Т. Ён адрэкамандаваўся Рагавой халастым, багатым чалавекам Курыліным Іванам, рабочым в Данбасу, казаў, што шукае сабе нявесту і зрабіў ёй прапанову выйсьці за яго замуж.

Рагавая—круглая сірата, няпісьменная, ня разьвітая, з малых год працуе па чужых людзях, цяпер была батрачкай у 75-гадовага дзеда Любезнага. Ёй няжка было працаваць, хацелася лепшай долі. Яна дала згоду ўдалому гарманістаму быць яго жонкай. Ёй здавалася, што, жыцьцё з гарміністым будзе такое-ж прыгожае, як прыгожа грае ў яго руках гармонік.

Дзехцяроў паказаў дзеду Любезнаму і Рагавой падробленыя дакуманты на імя Курыліна Івана і кніжку «Практычныя заняткі па сялянскай гаспадарцы», якую выдаў за сваю разьліковую кніжку. Няпісьменныя дзед і батрачка паверылі ашуканцу.

Дзехцяроў выйшаў з дзедам і на правах жаніха застаўся начаваць. У гэтую-ж ноч ён меў палавыя зносіны з Рагавой. Раніцою ўмовіліся, калі будзе шлюб. Дзехцяроў узяў чаравікі Рагавой і пайшоў у горад, каб там ёй купіць другія з калёшамі.

Больш Рагавая ўжо ня бачыла свайго «жаніха».

Апошні раз яна сустрэлася з ім у заалі Гомельскага акруговага суду, які прыгаварыў Дзехцярова за ашуканства на тры гады зьняволеньня ў суровай ізаляцыяй.

Вярхоўны суд прыгавар зацьвердзіў.

Б.

## На пленуме Менскага гарсавету

## Забесьпячэньне рабочых прадуктамі і прамтаварамі

### Даклад МЦРК

Чарговы пленум Менскага гарсавету 27-га чэрвеня быў прысьвечаны дакладу МЦРК аб пэрспэктывах **забесьпячэньня рабочых менску продуктамі і прамтаварамі.**

Дакладчык тав. **Кац** адзначыў, што ў чэрвені паступленьне хлеба з-за межаў Беларусі зусім спынілася, але затое павялічылася паступленьне збожжа з Бабруйскае акр. Слуцкага раёну. Хлеба мінулага ўраджаю хопіць да пачатку верасьня. У аднаго толькі ЦРК ёсьць на сёнешні дзень 120 вагонаў рознай мукі. Штодзенна МЦРК выпякае па 58 тысяч кілёграм розных хлебных вырабаў.

**Круп** ў МЦРК ёсьць 13 вагонаў. Гэтае колькасьці таксама хопіць да верасьня.

Зараз крамы МЦРК штодзенна прадаюць да 450 пуд. **рознага мяса.** Замінка з мясам, якая наглядалася ў пачатку чэрвеня, зараз ліквідавана. МЦРК мае на сёнешні дзень 600 галоў жывёлы. Адначасова МЦРК пачаў атрымліваць сьвініну, што дае магчымасьць палепшыць асартымэнт каўбасных вырабаў.

Сьвежую **рыбу** ЦРК атрымлівае больш-менш нармальна. Але колькасьць рыбы, якая прывозіцца з акруг Беларусі, ня можа задаволіць нават часткі попыту, і таму прывозіцца з Растову па 2-3 вогоны рыбы ў тыдзень.

Паступленьне **масла** ў чэрвені значна павялічылася. Адначасова павялічыўся посул масла на мясцовых рынках. Зараз ЦРК прыступіў да набыцьця некаторых запасаў. На халадзільніку ўжо ёсьць запас у 1.600 пуд. масла.

Значна павялічылася паступленьне **галяндзкага сыру.** На складах ёсьць каля 400 пудоў сыру.

Кожны дзень адпускаецца да 13 тысяч літраў малака. Аднак, у ня рыначныя дні гэтую колькасьць трэба лічыць малой.

ЦРК мае запас **алею** ў 6 тысяч пудоў, што забясьпечвае нармальную выдачу яе пайшчыкам да канца верасьня.

Тав. **Кац** спыніўся таксама падрабязна і на пэрспэктывах увозу іншых прадуктаў, як цукар, соль, селядцы і г. д.

Закрануўшы пытаньне аб **мануфактуры,** тав Кац гаворыць, што на 3-ці квартал МЦРК было выдзелена каля 20 вагонаў рознай мануфактуры. Ня гледзячы на тое, што квартал ужо канчаецца, лакуль што атрымана толькі каля 70 проц. ўсёй выдзеленай мануфактуры. У гэтым квартале было разьмеркавана 6 тысяч талёнаў на бялізну і 2.800 талёнаў на іншую мануфактуру. Гэтымі днямі будзе разьмеркавана яшчэ каля 4-х тысяч талёнаў на бялізну.

У 3-м квартале МЦРК закупіў **гатовага адзеньня** на 400 тысяч руб.—вырабу Белшвайтрэсту, Масшвэю і інш. Прадана тавараў на 550 тысяч рублёў. У бліжэйшы час ЦРК прыступае да загатоўкі тавараў на асеньня-зімовы сэзон. Мяркуецца закупіць гатовага адзеньня на 500 тысяч руб.

На зімовы сэзон закуплена каля 15 тысяч пар валенак, 10 тысяч пар бурак і 1.000 пар жаночых фэтравых ботаў. Частка гэтага тавару ўжо прыбыла. Згодна плёну, на будучы год намячаецца загатовіць абутку на 1 мільён 500 тысяч руб.

За мінулы год ЦРК рэалізаваў каля 100 тысяч пар **галёш.** На гэты год ЦРК вылучана такая-ж колькасьць галёш. Пакуль атрымана калу 20 тысяч пар галёш.

У мінулым годзе ЦРК закупіў 12.500 куб. саж. **дроў.** Сёлета заключаны дагавары на 16.500 куб. саж. Да восені мяркуецца завезьці каля 40 проц. усіх дроў, з такім разьлікам, каб ужо ў пачатку ліпеня пачаць доўгатэрміновае крэдытаваньне пайшчыкаў дрывамі.

* * *

Даклад МЦРК выклікаў ажыўленыя спрэчкі. Выказаліся т. т. **Штэйман, Гурына, Ваўчок, Міякіна, Рабіновіч, Дройкін, Лойка, Кобец і інш.** Усе выступаўшыя паказвалі на рад недахопаў у рабоце ЦРК.

Гаварылі аб тым, што часта ў крамах ЦРК прадаецца ня сьвежае мяса. Якасьць хлеба дрэнная. Рабочыя хлебазаводу павінны выканаць свае абавязкі, якія яны падпісалі пры ўступленьні ў сацыялістычнае спаборніцтва, і палепшыць якасьць хлеба.

Некаторыя дэпутаты зьвярнулі ўвагу ЦРК на грубасьць прадаўцоў. Значнае месца ў спрэчках было ўдзелена пытаньню аб грамадзкім харчаваньні, якое яшчэ дагэтуль знаходзіцца ў дрэнным становішчы.

Пленум гарсавету прапанаваў ЦРК правесьці рад мерапрыемстваў для паляпшэньня забесьпячэньня рабочых прадуктамі.

МЦРК павінен павялічыць загатоўку прадуктаў харчаваньня в тым, каб давесьці ўдзельную вагу гэтых груп у асартымэнце да 60 проц.

## Паведамленьні

**— ЦЭНТРАЛЬНЫЯ АНТЫРЭЛІГІЙНЫЯ КУРСЫ. 30-га чэрвеня г.г., роўна а 9 гадзіне ўвечары ў памяшканьні фізычнага інстытуту БДУ (земляробчы зав., № 4) адбудзецца адкрытая лекцыя навуковага працаўніка мэдфаку БДУ, д-ра В. Ф. Чарвакова аа тэму: «Мощи в свете научных данных», з дэманстрацыяй малюнкаў і дыяпазытываў.**

**Запрашаюцца рабочыя, служачыя і інш.**

**— ПЭДФАК БДУ. У аўторак, 2 ліпеня а 6-ай гадзіне адбудзецца адчынены агульны партыйны сход ячэйкі КП(б)Б пэдфаку БДУ з парадкам дня: 1) прапрацоўка матар'ялаў аб чыстцы партыі. 2) перавод з кандыдатаў у члены партыі.**

**— ДОМ АСЬВЕТЫ. Камсамольцы яч. Працасьветы, якія вылучаны для ўдзелу ў вайсковым паходзе, павінны зьявіцца сёньня а 6-й гадзіне з усімі патрэбнымі рэчамі.**

**— САД ПРАЦАСЬВЕТЫ. Сёньня, 29 чэрвеня адбудзецца вялікае гуляньне, канцэрт, кіно «Доктор Джэк», у садзе маюцца розныя гуляньні. Пачатак а 6-ай гадз. увечары.**

**Білеты ў касе саду.**

**— САД ХАРЧАВІКОЎ. Сёньня, 29-га чэрвеня даклад Наркамасьветы, дакладчык т. Мазур.**

**Пасьля дакладу—мастацкая частка.**

**Пачатак у 8 гадз.**

**Уваход па разданых білетах.**

**У садзе іграе духовы аркестр.**

**У панядзелак 1 ліпеня, а 7 гадзіне ўвечары ў Доме «Чырвонай арміі» склікаюцца жанчыны, скончыўшыя адміністрацыйна-гаспадарчыя курсы, хімічныя курсы лікідатараў, хімічныя каманды нархарчу і каманды пры Фрунзаўскім РК.**

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ


СЁНЬНЯ, 29 чэрвеня
роўна а 8 гадз. увеч. у памяшканьні клюбу саўгандальслужачых, СКЛІКАЕЦЦА
АГУЛЬНЫ СХОД усіх працаўнікоў МЦРК
ПАРАДАК ДНЯ: 1) Аб заключэньні палітычна—гаспадарчага дагавору з працаўнікамі Віцебскага ЦРК, 2) Выбары упоўнаважаных для падпісаньня дагавору, 3) Выбары брыгады для пагляданьня за ходам і кіраўніцтва спаборніцтвам.
Пасьля сходу—МАСТАЦКАЯ ЧАСТКА.
Белбюро Гнадлёвай Сэкцыі

ТЭАТР і КІНО

ТЭАТР „ПРАФІНТЭРН"
Гастролі Ленінградзкага Дзярж. тэатру драмы (б. „Александрынскі")
СУБОТА, 29-га чэрвеня „ДЕЛЕЦ" Кам. у 6 к. Глазенкіле Вера
Пачатак а 8 з пал. гадз. увеч.
Білеты у касе тэатру і ў раб. касе.

Тэатр „ПРАФІНТЭРН"
Нядзеля, 30 чэрвеня
2-гі і апошні КАНЦЭРТ
К. І. КАВАЛЬСКАГА
На „ТЭРМЭН-ВОКСЕ"
ТЭРМЭН-ВОКС—гэта новы электра-музычны апарат, на якім іграюць рукамі ў прасторы, не дакранаючыся інструманту.
Падрабязнасьці ў афішах. Пачатак а 9 гадзіне.
Білеты продаюцца ў раб. касе ад 12—2 і ад 4—6 г., у дзень канцэрту ад 6 гадз. увеч. у касе саду «Прафінтэрн».

КІНО-ТЭАТР „Культура" 2-гі і апошні тыдзень пастаноўкі мастацкага фільму „КАЛАМУТА" у 7 ч. Пач. роўна а 8 г. увеч. Каса—ад 6 гадз.
Кіно-сад ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА Савецкая, 71. Новая амэрык. пастаноўка з жыцьця амэрык. яўрэяў ПАТАШ і ПЭРЛАМУТР вясёлая камэдыя ў 8 частках.
КІНО Інтэрнацыянал Мастацкі-бытавы фільм у 6 частках. „Сьмяецца жыцьцё, плачуць людзі" Звыш праграм.—Кіно-хроніка Саукіно № 32
КІНО Пралетары ПАТ і ПАТАШОН у бліскучай камэдыі ПАТ АРЫСТАКРАТ у 7 частках.
КІНО СпартаК ВЫДАТНЫ КІНО-ФІЛЬМ ГАМБУРГ драма у 8 частках. Каса—ад 6 гадз. Пачатак 1-га сэансу а 7 г. 30 м.

Панядзелак, 1 ліпеня. Тэатр „ПРАФІНТЭРН" Толькі 1 гастроль
ВЕЧАР БАЛЕТУ
пад кіраўн. вядомага балетмэйстра М. СОБОЛЬ
У балеце прымае ўдзел лепшы у СССР клясычны піруэтысты
Александр СОБОЛЬ
ПАДРАБЯЗНАСЬЦІ Ў АФІШЫ.
Пачатак а 9 г. увеч. Білеты ў раб. касе.

АНОНС! ДЗЯРЖЦЫРК
1-шы РАЗ у БССР
гэтымі днямі гастролі лепшага расійскага муштравальніка
Уладзімера ДУРАВА (МАЛОДШАГА).
Самыя рэдкія экзэмпляры зьвярыны і птушак усіх частак сьвету.
Транспарт зьвяроў, жывёлы і птушак Ул. А. ДУРАВА нядаўна прывезены з-за граніцы 8 вагонаў 8.

ТЭРМІНОВА ПАТРАБУЕЦЦА
вольны ТРАКТАРЫСТЫ для працы на гусяніччным трактары «Клетрак»
Аб умовах працы даведацца пісьмова ці непасрэдна у Меліярацыйнай Групы НКЗБ—Менск, Савецкая, 70, 2-гі паверх.

14 ліпеня г. г. у м-ку Лагойск, Мен. акр.
АДБУДУЦЦА
ТАРГІ на здачу саду,
ппадовых дрэў 820. Пачатковая сума 2136 руб.
Лагойскі РВК.

АДПУСКНІКІ!
НЕ ЗАБУДЗЬЦЕСЯ ПЕРАД АДЫХОДАМ — У ВОДПУСК ПАВЕДАМІЦЬ У —
кантору газэты „ЗЬВЯЗДА" Савецкая, 63 тэл. 7-81
ВАШ НОВЫ АДРАС.
Вам будзе пасылацца «ЗЬВЯЗДА» па месцы знаходжаньня у водпуску
без асобнай даплаты за перамену адрасу.

СЁНЬНЯ, 29 чэрвеня
ДЗЯРЖЦЫРК
Апошнія 2 гастролі
ПЕРШЫ РАЗ У БССР
Афрыканскія вяпіканы ЛЬВЫ адважнага ўкраціцеля Максіміліана ТРУЦЬЦІ Эрнэста ШУ перад ад'ездам у ПАРЫЖ.
Апошнія 2 гастролі суоьветна гумартыстага
Пачатак вячэрняга прадстаўленьня а 9 гадз. увеч.
У нядзелю, 30 чэрвеня Чарговы дзіцячы равішнік з удзелам у апошні раз ЛВОУ -вліканаў ЭРНЭСТА ШУ І УСЯ ТРУПА.
Пачатак роўна а 2 гадз. дня.

ДАВОДЗІЦЦА ДА ВЕДАМА ПАДПІСЧЫКАЎ,
якія не атрымалі першай кнігі (III т.) са збору
ТВОРАЎ У. І. ЛЕНІНА на БЕЛМОВЕ,
што першы тыраж разасланы ў чарговым парадку па тэрміне падпіскі—цалкам.
Асобы, якія не атрымалі адзначанага твору, атрымаюць яго па выхадзе з друку другога выданьня гэтага тому ў ліста-падзе—сьнежні 1929 году.
Бюро падпіскі і кнігі—поштай БДВ. Менск, Пляц Волі, д. № 5.

На ЛІПЕНЬ і да канца году.
Падпішэцеся загадзя на 2-е паўгодзьдзе 1929 г. НА ГАЗЭТУ ЗЬВЯЗДА
На ЛІПЕНЬ і да канца году.
УМОВЫ ПАДПІСКІ: на 1 м.—90к., на 3м.—2 р. 60 к., на 6 м.—5 р., на 1 г.—9 р. 75 к.
«Зьвязда» дае сваім падпісчыкам дадаткамі на льготных умовах часопісі

| БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ | Рабоче-Крестьянский КОРРЕСПОНДЕНТ | ОГОНЕК |
|---|---|---|
| 1 м.—20 к. (замест 35 к.) | 1 м.—25 к. (замест 30 к.) | 1 м.—25 к. (замест 40 к.) |

Пасьпяшэцеся СЁНЬНЯ-Ж здаць падпіску, каб адмінуць перапынку ў атрыманьні газэты „ЗЬВЯЗДА" з 1-га ліпеня

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты адбываецца да 2-ое гадзіны дня

Кошт публікацыі 50 к. аб згубе дакуманту

Рэсп. Бюро АРУ
Даводзіцца да ведама сяброў АРУ, што ў ліпені м-цы г. г. Рэсп. бюро арганізуюцца
НОВЫЯ ГУРТКІ
па вывучэньні
КАПІРВУЧОТУ,
жадаючыя займацца ў гурткох павінны запісацца ў канцылярыі АРУ. Там жа падрабязныя справкі.
Запісь прымаецца да 5 ліпеня.

У панядзелак, 1-га ліпеня, г. г. у памяшканьні летняга саду „Друкароў"
АДБУДЗЕЦЦА
ДЫСПУТ
на пытаньні „ці патрэбен рабочаму-глядачу цырк"
У дыспуце прымаюць удзел: дырэктар дзярж. цырку—т. ФОГЭЛЬ (уступнае слова), прадстаўнікі ЦСПСБ, грамадзкіх арганізацый, рэдакцый мясцовых газэт, а таксама усе жадаючыя.
Пасьля дыспуту адбудзецца шэраг выступленьняў артыстых дзярж. цырку.
Уваход па разданых і запрашальных білетах на прадпрыемствах паліграфвыторчасьці.
Пачатак роўна а 7 гадз. увечары.
КУЛЬТАДДЗЕЛ ЦП САЮЗУ ДРУКАРОЎ

Если вы хотите бесплатно научиться играть на балалайке, подпишитесь на ЖУРНАЛ ДОСУГА „ЗАТЕЙНИК" лучший балалаечник Москвы П. Луковников в каждом номере, начиная с № 6, дает уроки всем желающим.
ПОДПИСНАЯ ПЛАТА на 2-е полугодие: 6 мес.—1р. 90к., 3 мес.—1р. Отд. № 35 к. Подписку адресуйте: Москва. Центр. Новая пл., 6, Изд-во „МОЛОДАЯ ГВАРДИЯ", либо сдавайте на почту.


## Згубленыя і ўкрадзеныя дакуманты лічыць несапраўднымі

Кандыдацкая картка № 621 Шыркана ва В. Я., выд. партарганіз. 5 корпусу. 1933

Беспрац. кніжка і 2 біржавыя талёны Вайнерчук Р. С. 1934

Каапэрац. кніжка Ждановіча Г. О., выд. Бабруйск. ЦРК. 1935

Асабов. пасьведч. № 18-а Апанасьвіча І., выд. К-рай Сл. цягі ст. Менск МБВ ч. 1936

Прыпісн. кніжка дапрызыўн. Гімпелева С. І., выд. Мен. ваенкамат. 1937

Патэнт 1 разр. Перавозкіна Г. З., выд. Менск. Акрфа. 1938